Напомним, в начале апреля сайт Мингорисполкома распространил информацию о запрете в столице продажи пива в летних кафе и на выносных лотках. Ссылка была на предложение председателя Мингорисполкома Михаила Павлова, прозвучавшее 2 апреля на оперативном совещании. Михаил Павлов якобы предложил не давать разрешения на продажу этого напитка в центре города в палатках, уличных кафе и на выносных лотках. По словам Николая Дудко, *"это не был как таковой запрет, как его восприняла пресса и общественность, — был поднят вопрос, насколько это важно для жителей города и насколько это полезно и удобно". "Был поставлен вопрос о том, чтобы уровень обслуживания в этих точках был цивилизованным"*, — сказал Дудко.

По материалам информагентств.

СІТУАЦЫЯ

Чацвёртая спроба

У першыя выхадныя пасля "Чарнобыльскага Шляху" аргкамітэт па стварэнні "Маладога фронту" мяркуе правесці ўстаноўчы сход Мінскай гарадской арганізацыі, крыху пазней — рэспубліканскі сход. Маладыя людзі імкнуцца дзейнічаць у рамках закона і выключна як афіцыйна зарэгістраваная арганізацыя. Апошняй перашкодай да гэтай мэты з'яўляецца адсутнасць юрыдычнага адрасу.

Доўгі шлях у Мінюст

Аргкамітэт па стварэнні "Маладога фронту" хацеў правесці ўстаноўчы сход ужо 14—15 красавіка, але па незалежных ад заснавальнікаў арганізацыі прычынах мерапрыемства не адбылося. Цяпер, па словах нефармальнага лідэра Дзмітрыя Федарука, ужо ў першыя выхадныя дні пасля "Чарнобыльскага Шляху" (субота і нядзеля выпадаюць на 28—29 красавіка) спачатку пройдзе ўстаноўчы сход Мінскай гарадской арганізацыі, на якой мусяць прысутнічаць не менш за 10 чалавек, пазней — рэспубліканскі сход. Дз.Федарук падкрэслівае, што ўсе намаганні маладых людзей скіраваныя на афіцыйную рэгістрацыю, якая дазволіць маладым людзям выйсці з падполля і дзейнічаць законна.

"Мы хочам паказаць усім, што мы — не проста незарэгістраваная арганізацыя, мы хочам мець афіцыйны, дзяржаўны статус, і дзейнічаць законна", — адзначае Дз.Федарук.

Гэта будзе ўжо чацвёртая спроба маладых людзей афіцыйна зарэгістравацца. Якраз зараз у Савецкім судзе Мінска знаходзіцца крымінальная справа адносна пяцярых маладафронтаўцаў па артыкуле 193 частцы 1 — "дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі". Па справе ў якасці абвінавачаных праходзяць пяцёра маладых людзей 16—22 гадоў: Насця Палажанка, якой могуць і не даць скончыць 10-ы клас СШ №73 Мінска; Аляксей Янушэўскі, Алег Корбан, Барыс Гарэцкі, Дзмітрый Федарук. Па гэтым артыкуле ўжо асуджаны і адбывае пакаранне ў шклоўскай калоніі Дзмітрый Дашкевіч...

"Суддзя Аляксей Таманаў ужо амаль скончыў знаёмства з матэрыяламі крымінальнай справы і хутка прызначыць дату судовага разгляду", — кажа Дзмітрый Федарук і прагназуе, што судовы працэс пачнецца ў канцы красавіка.

Апошні бар'ер

Апошнім, але найцяжэйшым для маладафронтаўцаў, бар'ерам з'яўляецца пошук юрыдычнага адрасу для арганізацыі. Шукаюць офіс пад юрыдычны адрас — ці нічога не знаходзяць, ці тое, што прапануюць улады, маладым людзям проста не па кішэні.

Толькі за гарантыйны ліст на юрыдычны адрас Галоўнае гаспадарчае ўпраўленне кіраўніцтва справамі прэзідэнта патрабуе 2250 еўра; разам з арэндным платай — гэта непад'ёмная для аргкамітэта сума.

18 красавіка "Малады фронт" яшчэ раз публічна звярнуўся па дапамогу да ўсіх, хто мае такую магчымасць, дапамагчы з юрыдычным адрасам. Адзін з лідэраў МФ Дзмітрый Федарук кажа, што прадстаўнікі аргкамітэта "ўжо абышлі трычатыры структуры, аднак пакуль беспаспяхова".

"Аргкамітэт па рэгістрацыі "Маладога фронту" займаўся пошукамі юрыдычнага адрасу цягам некалькіх месяцаў. Галоўнае гаспадарчае ўпраўленне кіраўніцтва справамі — уласнік большасці адміністрацыйных памяшканняў у горадзе Мінску — патрабуе за дазвол (гарантыйны ліст) на арэнду памяшкання 2250 еўра, што цалкам не адпавядае фінансаваму становішчу маладзёжнага руху, які на працягу ўсяго часу працаваў на аснове валанцёрства і добраахвотнай працы.

Акрамя Галоўнага гаспадарчага ўпраўлення кіраўніцтва справамі, мы звярнуліся да ўсіх вядомых нам арганізацый, якія маюць уласныя памяшканні, але з-за шэрагу прычын (у асноўным з-за нешматлікасці такіх устаноў, на балансе якіх знаходзяцца лічаныя квадратныя метры плошчы) ніводнага падыходзячага варыянту намі не знойдзена", — паведамляе аргкамітэт.

Рэгістрацыя — гэта спроба паказаць уладзе, што "актывісты руху дзейнічаюць згодна з Канстытуцыяй і імкнуцца выканаць усе патрабаванні закона". Перашкодай на гэтым шляху з'яўляецца толькі адсутнасць юрыдычнага адрасу.

Працяг будзе?..

Пакуль суд ды справа, па рэгіёнах узнялася чарговая хваля допытаў маладафронтаўцаў. Нехта кажа, што рыхтуюцца новыя крымінальныя справы за дзейнасць "ад імя незарэгістраванай арганізацыі" супраць рэгіянальных актывістаў, нехта сцвярджае, што людзей, якіх цягаюць на допыты, рыхтуюць у якасці сведкаў на "суд пяцярых".

18 красавіка хваля допытаў пракацілася па Бабруйску, Магілёве, Асіповічах, Шклове. Дз.Федарук мяркуе, што, магчыма, гэтыя людзі пойдуць сведкамі па асноўнай крымінальнай справе; школьніца Насця Палажанка выказвае думку, што рыхтуюцца новыя крымінальныя справы супраць маладафронтаўцаў у рэгіёнах.

"Адразу пасля прэзідэнцкіх выбараў у 2006 годзе супраць маладафронтаўцаў былі ўзбуджаныя, наколькі мне вядома, 14 крымінальных спраў. Кагосьці прыцягвалі да крымінальнай адказнасці па абвінавачванні ў паклёпе на прэзідэнта, некага, як і нас, судзілі пра 193-м артыкуле. Калі меркаваць па тым, што адбываецца ў краіне, прагназаваць можна самае горшае", — мяркуе Дзмітрый Федарук.

Няўжо няма іншага занятку, як ламаць падлеткам жыцці?

Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.

АКЦЫЯ

Мінгарвыканкам накіраваў «Чарнобыльскі Шлях» на Бангалор

Мінскі гарвыканкам даў дазвол на правядзенне ў сталіцы "Чарнобыльскага Шляху-2007", аднак змяніў маршрут следавання дэманстрантаў і месца правядзення акцыі.

Заяўнікамі акцыі выступілі намеснік старшыні Партыі БНФ Аляксей Янукевіч і член сойма Партыі БНФ Юрась Зянковіч, член палітсавета Аб'яднанай грамадзянскай партыі Валянціна Палевікова і намеснік старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Анатоль Сідарэвіч. Як паведаміў Аляксей Янукевіч, гарадскія ўлады дазволілі правесці 26 красавіка шэсце па тратуарах ад будынка прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па вуліцы Сурганава да плошчы Бангалор з мітынгам у парку Дружбы народаў з 20.00 да 22.00. *"Аднак мы заявілі аб нязгодзе з гэтым рашэннем Мінгарвыканкама, якое прынята з парушэннем заканадаўства, паколькі было зменена месца правядзення мерапрыемства без узгаднення з яго заяўнікамі. З-за таго, што ніхто з намі не ўзгадняў гэтае пытанне, мы вывучаем магчымасць звароту ў суд для абскарджання рашэння гарадскіх улад, а таксама будзем кансультавацца па фармаце правядзення шляху"*, — зазначыў Янукевіч.

Нагадаем, што, згодна з заяўкай, пададзенай 4 красавіка, удзельнікі акцыі планавалі сабрацца ў 18.00 на плошчы імя Якуба Коласа, прайсці па тратуарах праспекта Незалежнасці да плошчы перад будынкам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, дзе ў 20.00 павінен пачацца мітынг.

Марат ГАРАВЫ.

БЕЛАРУСЬ—РАСІЯ

Беларусі прапанавалі аддаць «Белтрансгаз»

Як мы паведамлялі, Беларусь запрасіла ў Расіі крэдыт у паўтара мільярда долараў. Як стала вядома расійскім журналістам, адказ атрыманы такі: расійскі ўрад гатовы даць крэдыт, але пад заклад акцый ААТ "Белтрансгаз". Такім чынам, расійскі бок не пакідае спроб узяць беларускае газатранспартнае прадпрыемства пад свой поўны кантроль.

Калі выходзіць з рынкавага кошту "Белтрансгаза", у заклад могуць патрапіць да 30% акцый беларускага прадпрыемства.

"У адрозненне ад папярэдніх крэдытаў, якія Расія давала Беларусі, гэтым разам прад'яўляюцца больш сур'ёзныя патрабаванні да ўмоў, на якіх гэты крэдыт можа быць выдадзены. Магчыма, пад заклад акцый. А з прычыны таго, што ў Беларусі толькі адно прадпрыемства ацэнена па міжнародных стандартах — ААТ "Белтрансгаз", расійскі бок можа запатрабаваць забеспячэння гэтага крэдыту акцыямі гэтага прадпрыемства", — цытуе агенцтва "Прайм-ТАСС" крыніца, блізкая да беларускага ўрада. А расійская крыніца газеты "Коммерсант", знаёмая з ходам перамоў, удакладніла: *"Гэтую пазіцыю працінуў "Газпром" — праз перамовы па СП, якія зацягнуліся"*.

У Мінфінах Расіі і Беларусі, ва ўрадзе Беларусі і ў "Газпроме" адмаўляюцца каментаваць пазіцыі бакоў, пакуль ідуць перамовы. Але дакладна вядома, што папярэднія тэхнічныя крэдыты былі прадстаўлены Расіяй Беларусі без усялякіх гарантый каштоўных папер. Новыя патрабаванні крыніца, блізкая да расійскага МЗС, растлумачыла тым, што ва ўмовах нестабільных транзітных стасункаў, калі беларусы маюць намер павысіць кошт транзіту расійскіх тавараў і арэнды расійскіх аб'ектаў, Расіі патрэбны дадатковыя гарантыі пагашэння крэдыту. Для Беларусі ж атрыманне крэдыту на такіх умовах будзе азначаць фактычную перадачу акцый "Белтрансгаза" "Газпрому", піша "Коммерсант".

УРАЖАННІ

Калі я бачу над людской калонай мора бел-чырвона-белых сцягоў, я, паверце, адчуваю душэўны ўздым

Добры дзень "Народная воля"!

Я доўга вагаўся, дасылаць ці не гэты ліст у газету. З 25 сакавіка прайшло шмат часу і, магчыма, мой матэрыял устарэў. Але, паразважаўшы, прыйшоў да высновы, што пакуль працягваюцца рэпрэсіі супраць актывістаў апазіцыі, арганізатараў і ўдзельнікаў масавых акцый: затрыманні, пратрусы, допыты, суды, арышты, штрафы — гэта тэма застанецца актуальнай.

Я нічога не буду абагульняць, не буду гаварыць ад імя народа, для гэтага ёсць вопытныя палітолагі, сацыёлагі, журналісты. Я проста хачу падзяліцца сваімі асабістымі ўражаннямі.

25 сакавіка, калі адзначаецца чарговая гадавіна абвяшчэння БНР, для мяне найвялікшае свята. У гэты дзень я бяру свой бел-чырвона-белы сцяг, іду на вуліцу і далучаюся да калоны неабыякавых да гісторыі нашай краіны грамадзян. Калі я бачу над людской калонай мора бел-чырвона-белых сцягоў, я, паверце, адчуваю душэўны ўздым. Так адбываецца штогод. Вось і сёлета ў гэты дзень я накіраваўся на Кастрычніцкую плошчу (у народзе яе ўжо называюць плошчай Кастуся Каліноўскага). На станцыі метро "Плошча Перамогі" прагучала аб'ява, што на Кастрычніцкай цягнік не прыпыняецца. Амаль усе пасажыры выйшлі, вагоны апусцелі. Людзі суцэльным патокам рухаліся да месца збору. Але за цыркам праспект перагарадзіў міліцэйскі кардон. А людзі прыбывалі і прыбывалі, ужо сабралася некалькі тысяч чалавек, пляцоўка перад цыркам усіх не ўмяшчала. Міліцэйскі начальнік выклікаў падмогу. Пад'ехалі машыны са спецназам. Афіцэры сталі муштраваць салдат, па іх камандах салдаты калонай бегалі туды-сюды, моцна грукаючы ботамі. Гэта была своеасаблівая размінка. Такія дзеянні я называю псіхічнай атакай, але гэта ў людзей выклікала толькі рогат.

Я наблізіўся да гэтай бязлікай казарменна-спецназаўскай масы, каб зазірнуць у вочы канкрэтнаму салдату. Я — былы вайсковец і навучыўся, зірнуўшы на салдата, атрымаць аб ім першапачатковае ўражанне. Перада мной у касках стаялі салдаты першага года службы, у іх былі запалоханыя шырока расплюшчаныя вочы. Магчыма, іх упершыню вывелі на вуліцу, каб "абкатаць", даць магчымасць атрымаць першае баявое хрышчэнне. Не выключаю, што перад гэтай "баявой" аперацыяй іх добра праінструктавалі, што на вуліцу выйшаў раз'юшаны, п'яны натоўп экстрэмістаў, які хоча захапіць "дзяржаўную" плошчу, каб знішчыць знак "Нулявога кіламетра" ў адместку за знішчэнне "Лавы Клінтана" ў Курапатах, забрудзіць каналізацыю і ў водаправодную трубу засунуць пацука.

Але гэтыя маладыя салдаты, якія не па сваёй волі надзелі форму не танкіста, а спецназа, каля Дзяржаўнага цырка ўбачылі юнакоў і дзяўчат, сваіх аднагодкаў, убачылі сваіх бацькоў і нават дзядуль і бабуль. Усе яны трымалі ў сваіх руках плакаты і бел-чырвона-белыя сцягі, а не абрэзкі труб, манцыроўкі і ламы, як, зноў жа не выключаю, папярэджвалі іх начальнікі.

У адрас гэтых маладых салдат заўчасна крычаць абражальнае "Ганьба!", яны адслужаць свой тэрмін у гэтым, магчыма, для многіх не надта прыемным спецназе і большасць з іх будзе сумленна працаваць на новую, вольную, незалежную Беларусь.

Другая справа — амапаўцы, спецназаўцы, якія нясуць службу па кантракце. Змагацца з бяззбройным насельніцтвам — іх асноўная праца. Гумовая дубінка — гэта іх карміліца. Ім усё роўна, хто перад імі — падлетак, юнак, дзяўчына, жанчына, брат, сястра... Загад будзе выкананы. Прыкладаў іх неапраўдана жорсткіх, нават зверскіх, дзеянняў вельмі шмат. Вось тут "Ганьба!" у іх адрас будзе да месца.

Але вернемся на праспект. Людзі павольна рухаліся па тратуары да Акадэміі навук. Раптам усе разам пачалі скандзіраваць "За-бой-ца!!! За-бой-ца!!! За-бой-ца!!!". Як высветлілася, у машыне праехаў начальнік з вялікімі зоркамі на пагонах, вельмі падобны на таго, каго падазраюць у знікненні вядомых палітыкаў.

Да калоны далучаліся ўсё новыя і новыя людзі, яны пад'язджалі на метро і іншымі відамі транспарту. Па левым тратуары праспекта ад сквера Янкі Купалы таксама рухаўся ў тым жа напрамку людскі ручаёк. Гэта тыя, якім яшчэ боязна стаць у агульную калону і наіўна спадзяюцца, што так ім больш бяспечна. Але дарэмна. Яны яшчэ не ведаюць, што амапаўцы пачынаюць збіваць і хапаць людзей там, дзе іх менш. Так яно і здарылася! На мосце праз Свіслач частку людзей адсеклі і заблакіравалі. Людзі апынуліся ў пастцы. Але ўсё абышлося. На гэты раз спецназаўскі начальнік навучаў маладых салдат, як трэба рассякаць людскую калону, навучаў тактыцы бою ва ўмовах горада супраць бяззбройнага ўласнага насельніцтва.

Пасля плошчы Перамогі я ўбачыў, што міліцэйскі ланцуг складзены нават з жанчын-міліцыянтак. Не ведаю як каму, а мне гэта здалося нейкім дзікунствам. Ці жаночая гэта справа — стаяць з дубінкай у гатоўнасці яе прымяніць супраць мірных людзей. Сярод міліцыянтак і маладыя прыгожыя дзяўчаты, і пажылыя жанчыны. Падумалася: а калі іх дзеці сярод дэманстрантаў — такое ж бывае часта, калі бацькі і дзеці па розныя бакі барыкад. Вось тут у адрас міліцэйскіх начальнікаў, якія супраць дэманстрантаў прыцягнулі жанчын, можна скандзіраваць "Ганьба!".

Што ні кажыце, а за апошнія 10—15 гадоў пэўным сілам удалося раскалоць Беларусь. Калі на пачатку дзевяностых адчувалася імкненне людзей да яднання, то цяпер відавочны зваротны працэс. І цемрашальныя сілы выкарыстоўваюць любую нагоду, каб спыніць аб'яднаўчы працэс. Яны ведаюць, што калі шматмільённы народ будзе разам, то ён хутка скажа сваё слова.

...На многія іншыя думкі наводзіць убачанае падчас святкавання 25 сакавіка. Галоўнае заключаецца ў тым, што пакуль тых, хто добра разумее значнасць гэтай даты, малавата. Але абнадзейвае тое, што ідэі Беларускай Народнай Рэспублікі жывуць і набліжаюць лепшыя часы.

Ілля КОПЫЛ,
жыхар г.Мінска,
пенсіянер, 72 гады.

Народная Воля http://www.nv-online.info
26 КРАСАВІКА 2007 г.

РЭАЛЬНАЯ ЭКАНОМІКА

Чорная справа

Нафтаперапрацоўка — сапраўдны гонар беларускай эканомікі: штогод яна дае 3—4 мільярды долараў у бюджэт, каб дзяржава магла своечасова выплачваць пенсіі і фінансаваць сацыяльныя праграмы, шматмільённыя праграмы па перааснашчэнні, нарэшце, забяспечваць высокія заробкі і для так званых "нафтавых каралёў", і для тых, хто проста працуе ў гэтай галіне. Але, на жаль, для апісання стану беларускіх НПЗ зараз трэба ўжываць дзеяслоў "было". З пачатку гэтага года галіна апынулася ў глыбокім крызісе, хаця умовы, у якіх яна сёння працуе, не самыя горшыя. Па крайняй меры, усім добра вядома, што год ад году яны будуць усё складаней.

Падножка

Як вядома, з гэтага года ўмовы паставак энерганосьбітаў у нашу краіну змяніліся. Па-першае, Расія ўвяла пошліну на нафту, якая пастаўляецца ў Беларусь. У гэтым годзе пошліна сімвалічная — 29,3% ад памеру расійскай — і, па вялікім рахунку, цана сырой нафты для нас не змянілася. Але з кожным годам памер пошліны будзе ўзрастаць, і ў 2011 годзе (дарэчы, гэта год наступных прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі) мы вымушаны будзем купляць расійскую нафту па тым жа кошце, што і ўсе астатнія краіны, — інакш кажучы, па міравых цэнах.

У той жа час ужо зараз істотна змяніліся ўмовы, на якіх Беларусь экспартуе нафтапрадукты: з гэтага года мы абавязаліся мець аднолькавы з Расіяй падатак пры экспарце нафтапрадуктаў, прычым большую частку гэтага даходу пералічваць у расійскі бюджэт. Беларускі ж бюджэт аказаўся аголеным: згубіць пару мільярдаў долараў — гэта вам не хухры-мухры...

Але афіцыйныя асобы ні ў якім разе не прызнаюць сітуацыю з нафтаперапрацоўкай крызіснай. Літаральна днямі першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка паведаміў, што праблемы ёсць, а крызісу няма, бо рэнтабельнасць заводаў складае 10%. Рэнтабельнасць — гэта паказчык эканамічнай выгады вытворчасці: спрацаваў "у мінус" — лічы страты, "у нуль" — без прыбытку, вышэй за нуль — ёсць грошы. Для НПЗ рэнтабельнасць 10% — вельмі нізкі і нават крытычны паказчык, бо на заводах укараняюцца дарагія праграмы мадэрнізацыі вытворчасці, а гэта грошы, грошы і грошы... Але, як высветлілася, Уладзімір Сямашка аказаўся супераптымістам. Прадстаўнікі Наваполацкага і Мазырскага НПЗ абверглі словы намесніка прэм'ер-міністра. На мінулым тыдні ў Мінску праходзіла міжнародная канферэнцыя па пытаннях нафтаперапрацоўкі ў Беларусі, дзе ўсе зацікаўленыя бакі атрымалі магчымасць агучыць свой дыягназ таго, што адбываецца ў галіне.

«Гэта нейкі цуд»

"Эканамічная палітыка ўрада прывяла да таго, што беларускія НПЗ сталі нерэнтабельныя. Гэта нейкі цуд, пры тым, што ва ўсім свеце нафтаперапрацоўка з'яўляецца прыбытковай. Акрамя таго, Беларусь купляе нафту на 100 долараў таннейшую ў параўнанні з сусветнымі цэнамі", — заявіў намеснік галоўнага інжынера ААТ "Нафтан" Анатоль Канстанцінаў. І адзначыў, што новыя ўмовы працы НПЗ ставяць пад сумненне выкананне прадпрыемствамі праграм рэканструкцыі і прагнозных эканамічных паказчыкаў. *"Ад гэтага залежыць дабрабыт дзяржавы, але як у гэтых умовах выконваць?.. Ніхто не можа сказаць, хоць усе сцвярджаюць, што ўсё будзе выканана"*, — абураўся прадстаўнік наваполацкага завода.

Ён таксама адзначыў, што ўрад абавязаў беларускія НПЗ выконваць міжгаліновыя пастаўкі араматычнай прадукцыі па цэнах, ніжэйшых за сабекошт, і гэта пры тым, што ў новых умовах прадпрыемствы і так нерэнтабельныя. Акрамя таго, дзяржава патрабуе павелічэння аб'ёмаў перапрацоўкі нафты, але "не дае паблажак па экалагічнай праблематыцы". *"А гэта перавышэнне выкідаў, за што нас могуць увогуле пазбавіць грошай у выглядзе штрафаў"*, — адзначыў Анатоль Канстанцінаў.

Не лепшая, а нават горшая сітуацыя на Мазырскім нафтаперапрацоўчым заводзе. Па выніках першага квартала прадпрыемства наогул спрацавала з адмоўнай рэнтабельнасцю. Пра гэта паведаміў галоўны тэхнолаг прадпрыемства Сяргей Тукач. І не дзіва! У прадпрыемства адабралі значную суму грошай у прымусовым парадку — у так званы Фонд нацыянальнага развіцця было пералічана больш за 100 мільёнаў долараў. Ні звароты да кіраўніка дзяржавы, ні лісты ва ўрад, ні спасылкі на тое, што адбіраюцца сродкі, неабходныя прадпрыемству для нармальнай працы, не дапамаглі. Зразумела, што завод быў вымушаны адразу ж ісці за крэдытамі. *"На папаўненне абаротных сродкаў нам неабходна ў месяц амаль 60 мільёнаў долараў, мы прыцягваем на гэтыя мэты крэдыты "Пріорбанка", "Белросбанка"*, — сказаў Сяргей Тукач.

Больш яскрава апісаў журналістам сённяшнюю сітуацыю на заводзе прадстаўнік незалежнага прафсаюза Юрый Швец. *"На Мазырскім нафтаперапрацоўчым склалася напружаная сітуацыя: рахункі прадпрыемства заблакіраваныя, працаўнікам урэзалі зарплату, спынены сацыяльныя выплаты. Гэта унікальны выпадак! Упершыню адна з самых рэнтабельных галін у свеце — нафтаперапрацоўчая — стала стратнай"*, — заявіў Юрый Швец.

...У Беларусі два нафтаперапрацоўчыя заводы. Прадстаўнікі абодвух канстатавалі, што сёння вытворчасць стала стратнай. Але намеснік старшыні канцэрна "Белнафтахім" Міхаіл Асіпенка мае іншую інфармацыю, хаця і яго паказчыкі адрозніваюцца ад лічбаў першага віцэ-прэм'ера. *"Пераканаўча заяўляю, што па выніках I квартала рэнтабельнасць беларускіх НПЗ склала не менш як 5%"*, — сказаў Асіпенка.

Ну, ці не цуд?! Вось ужо сапраўды, чым вышэй па службовай лесвіцы, тым лепшая карціна жыцця вымалёўваецца!

Дай, дай, дай...

Бадай, галоўнае, што сёння турбуе нафтаперапрацоўшчыкаў, — немагчымасць працаваць па давальніцкіх схемах. Схема гэтая простая, бо безграшовая: расійскія кампаніі пастаўляюць нафту, разлік за сыравіну вядзецца натурпрадуктам — вырабленымі бензінам, дызпалівам і таму падобным. Прапорцыя "колькі — каму", залежыць ад устаноўленых падаткаў, акцызаў і г.д., ад умоў працы, якія вызначае для нафтаперапрацоўшчыкаў урад. Зразумела, што ўрад жадае атрымаць ад НПЗ як мага большыя паступленні ў бюджэт (бо на працягу некалькіх гадоў нафтаперапрацоўка была асноўным донарам дзяржаўнай казны, давала магчымасць павялічваць пенсіі, зарплаты бюджэтнікам, розныя сацыяльныя выплаты, і як сёння ўсё гэта адабраць у людзей?), і сёння так званыя паборы вельмі высокія. Як вынік: расійскія кампаніі проста адмаўляюцца працаваць з беларусамі на давальніцкіх умовах, тлумачачы гэта проста — нявыгадна. Так, Сяргей Тукач канстатаваў, што на мазырскім прадпрыемстве значна скарацілася давальніцкая перапрацоўка нафты, і ў красавіку давальніцкія пастаўкі здзяйсняе толькі адна кампанія "Юнівест-М" (даччыная структура "Роснефти").

Зразумела, калі б у беларускіх прадпрыемствах былі грошы для закупкі сырой нафты — ніякіх праблем не было б. Але грошай няма. Урад верціцца-круціцца, каб неяк зацікавіць расіян, Аляксандр Лукашэнка нават пагражаў, што зробіць больш высокім тарыф на транспарціроўку нафты ў Еўропу праз нашу тэрыторыю для тых, хто не дае сырую нафту беларускім НПЗ, але расіяне ўсё роўна не спалохаліся... Урад быў вымушаны ісці на спецпошліну на "давальніцкую" нафту і часткова субсідзіраваць закупкі "чорнага золата" з бюджэту. Да нядаўняга часу субсідыя на тону складала 24 долары, зараз плануецца павялічыць субсідыю больш як у 2 разы (да 45,8 долара за тону). Гэта сапраўдны рэкорд: нідзе ў свеце нафтаперапрацоўка не з'яўляецца датацыйнай галіной!

Праўда, Анатоль Канстанцінаў, кажучы пра рашэнне ўрада субсідзіраваць расійскіх "давальцаў" і выплачваць НПЗ кампенсаванне на транспарціроўку нафты, падзівіўся: "Не зразумела, адкуль бяруцца гэтыя датацыі. Складаецца ўражанне, што ў нас адбіраюць сродкі і нам жа іх потым даюць, але ўжо ў іншым памеры..." Так яно і ёсць, але прадстаўнік "Белнафтахіма" Міхаіл Асіпенка крызісу тут не бачыць і запэўнівае: "Заводы загружаныя ў поўным аб'ёме. Давальніцкая перапрацоўка ў красавіку склала амаль 40% ад аб'ёму загрузкі, астатняе НПЗ набывалі за ўласныя сродкі".

Каб жа за ўласныя! За крэдыты.

Сыр у мышалоўцы

Змяненні ўмоў работы беларускіх НПЗ ужо выклікалі шэраг праблем у банкаўскім сектары, заявіў член праўлення ААТ "Пріорбанк" Вадзім Мацюшкін. Праблема, якая, паводле яго слоў, выявілася адразу, — нестабільнасць заканадаўства, якое рэгулюе дзейнасць нафтаперапрацоўшчыкаў. Спачатку былі рэзка паніжаны акцызы, што зрабіла дагэтуль стратны ўнутраны рынак вельмі прывабным, потым акцызы вярнулі практычна на былы ўзровень.

"Калі ў 2006 годзе 80% нафтапрадуктаў накіроўвалася на экспарт, 20% — на ўнутраны рынак, дык у 2007 годзе сітуацыя рэзка змянілася: усе кінуліся на ўнутраны рынак", — канстатаваў Вадзім Мацюшкін. Чаму гэта так хвалюе банкіраў? Ды таму, што яны крэдытуюць нафтаперапрацоўку, і адна справа — атрымаць у аплату выдадзенага крэдыту валюту, і зусім іншая — мець запазычанасць у беларускіх рублях.

Апрача таго, па словах Вадзіма Мацюшкіна, калі продажы "хістануліся" ў бок унутранага рынку, для прадпрыемстваў паўстала пытанне канвертацыі рублёвай выручкі для разлікаў па валютных крэдытах, іншымі словамі — валюту трэба было купляць на біржы. *"Гэта шматмільённыя сумы*, — зазначыў спецыяліст. — *Тут у нас не было стопрацэнтнай упэўненасці ў тым, што Нацыянальны банк зможа забяспечыць гэту канвертацыю"*. І гэта няўпэўненасць, паводле яго слоў, "працягвае прысутнічаць". Што нядзіўна, бо, як днямі прызнаўся той жа Аляксандр Лукашэнка, толькі ў канцы мінулага — пачатку гэтага года Нацыянальны банк патраціў трэцюю частку валютных запасаў на падтрымку беларускага рубля. Для простага чалавека гэта нейкая абстрактная інфармацыя, а банкіра яна прымушае задумацца, бо, не выключана, што ў адзін "цудоўны" момант банк проста не зможа на біржы канвертаваць рублі ў валюту, бо скажуць: "Валюты няма". І што тады рабіць з процьмай "зайцоў"?..

Тым больш што беларускія банкі самі не могуць поўнасцю прафінансаваць НПЗ (не такія ўжо яны моцныя) і таксама шукаюць грошы — за мяжой.

"Патрэбы ў фінансаванні нафтаперапрацоўчых заводаў Беларусі нацыянальная банкаўская сістэма самастойна задаволіць не можа", — адназначна заявіў Вадзім Мацюшкін.

Паводле яго слоў, банкі *"прыйшлі да высновы аб неабходнасці прыцягваць сродкі замежных партнёраў, з тым каб разраджаць сітуацыю"*. Разам з тым, адзначыў В.Мацюшкін, *"гэтыя крыніцы знаходзяцца не так лёгка". "Мы ведаем групу заходніх банкаў, якія актыўна ўдзельнічаюць у фінансаванні нафтагандлю ва Усходняй Еўропе, але запэўніваю, зацягнуць кагосьці ў сумеснае крэдытаванне нават нашых вядучых прадпрыемстваў не так проста"*, — заявіў ён.

Банкір прадставіў разлікі, згодна з якімі пры гадавым балансе паставак нафты ў Беларусь у 20 мільёнаў тон штоквартальна павінна завозіцца каля 5 мільёнаў тон. *"Пры тым, што некалькі расійскіх давальцаў пакуль засталіся на рынку, 600—700 тысяч тон на месяц НПЗ павінны закупляць самі, а гэта як мінімум 150—170 мільёнаў долараў"*, — адзначыў банкір. Такая штомесячная патрэба ў фінансаванні беларускіх НПЗ, падсумаваў прадстаўнік кіраўніцтва "Пріорбанка", ацаніўшы гэтыя сумы як "гранічныя". Між тым, як добра вядома, у банках існуюць нарматывы бяспечнага функцыянавання, і банк не павінен аддаваць амаль усе свае сродкі на крэдыты. *"На гэты момант у "Пріорбанку" доля крэдытаў у структуры баланса складае 80%. Па заходніх стандартах, гэта крытычная адзнака, аптымальным узроўнем лічыцца 60—70%"*, — падкрэсліў фінансіст.

Дарэчы, ужо неаднойчы гучалі меркаванні незалежных экспертаў аб тым, што палітыка, якая заганяе беларускія НПЗ у аграмадныя даўгі перад банкаўскімі структурамі, вельмі небяспечная. Многія расцэньваюць тое, што адбываецца сёння, як падрыхтоўку беларускіх НПЗ да перапродажу замежным інвестарам. Прадпрыемства-банкрут, як вядома, каштуе значна дзешавей, чым тое, якое працуе паспяхова. Ці разумее беларускі ўрад, што, выцягваючы ўсе грошы з НПЗ, ён проста штурхае лепшыя заводы да банкрутства? Ці асэнсоўвае, што сёння можна кіравацца прынцыпам "дзень прастаяць ды ноч пратрымацца", але што будзе заўтра? Дарэчы, менавіта па такой схеме расійскія алігархі скуплялі дзесяць-пятнаццаць гадоў таму расійскі нафтавы сектар: спачатку заганялі прадпрыемствы ў даўгі, а потым куплялі за невялікія сумы і станавіліся алігархамі. Хто ўдабрае глебу для таго, каб свае алігархі з'явіліся і ў Беларусі?

Дзе выйсце?

Як заўсёды, беларусы шукаюць свой шлях там, дзе ўвесь свет ідзе іншым. Каб выратаваць нафтаперапрацоўку, Беларусь рыхтуецца да манаполіі ў гандлі нафтапрадуктамі. Да 1 ліпеня павінна быць створана "Беларуская нафтавая кампанія" — дзяржаўная структура, якая будзе займацца закупкай нафты і рэалізацыяй нафтапрадуктаў. Пра гэта паведаміў намеснік старшыні канцэрна "Белнафтахім" Міхаіл Асіпенка. Пры гэтым ён выказаўся за неабходнасць захавання давальніцкай нафтаперапрацоўкі датуль, пакуль не заробіць у поўную сілу БНК, што ствараецца па прыкладзе "Беларускай калійнай кампаніі", якой належыць выключнае права экспарту калійных угнаенняў.

Дарэчы, "Беларуская калійная кампанія" — не самы лепшы прыклад. Пасля таго, як са скандаламі і разборам палётаў экспарт калійных угнаенняў аддалі ў адны рукі, выручка з продажаў амаль не павялічылася, хаця сабекошт павялічыўся значна. Многія памятаюць і тое, як паўгода "каўбасіла" "Беларуськалій", бо новыя гандляры не здолелі заключыць кантракты з галоўнымі і найбуйнейшымі пакупнікамі прадукцыі салігорскіх калійшчыкаў. Не выключана, што тое самае чакае і нафтаперапрацоўку, бо сусветны рынак нафтапрадуктаў зусім не адкрыты, па крайняй меры, новых ігракоў проста так не прымае.

Прагноз

Генеральны дырэктар расійскай даследчай групы "Петромаркет" Якаў Рудэрман скептычны ў сваіх прагнозах адносна будучыні беларускіх НПЗ. Ён нагадвае, што ў Расіі ўжо прынята рашэнне з чэрвеня павялічыць экспартную пошліну на нафту да 200 долараў за тону (такім чынам, нафта для нашай краіны стане даражэйшай ужо ў гэтым годзе). Акрамя таго, эксперт адзначае, што Расія пачынае рэалізацыю праектаў будаўніцтва нафтаправодаў у абход Беларусі, што "можа негатыўна сказацца на загрузцы беларускіх НПЗ". Маецца на ўвазе праект будаўніцтва ў хуткім часе нафтаправода "Унеча—Прыморск", а таксама "Усходняя Сібір — Ціхі акіян". Апошні, здавалася б, не можа мець да нас ніякага дачынення. Але... Справа ў тым, што нафтаправод на Ціхі акіян у бліжэйшы час не можа быць запоўнены ўсходнесібірскай нафтай, значыць, "чорнае золата" будуць браць з Заходняй Сібіры. А гэта — тая самая крыніца, з якой нафта пастаўляецца ў Беларусь. Як тлумачыць кіраўнік "Петромаркета", "калі эканоміка новага накірунку будзе больш выгаднай, то значна пацерпяць старыя рынкі, у тым ліку беларускі". *"У гэтай сітуацыі*, — упэўнены Рудэрман, — *рашэнне можа быць знойдзена толькі на палітычным узроўні"*.

Думаць, думаць і думаць!

Выснова напрошваецца толькі адна: Беларусь не можа мець "нафтавы бюджэт" па той простай прычыне, што не з'яўляецца нафтавай краінай. Ці здолее ўрад пераарыентаваць эканоміку?.. Ці з'явіцца ў Беларусі новае "залатое дно", якое кампенсуе бюджэту страты, якія панесены ад таго, што спынены льготныя ўмовы для нафтаперапрацоўкі?.. Магчыма, у некага склалася меркаванне, што выйсце знойдзена, бо дзяржаўныя СМІ штодня трубяць пра праекты з іранскай, венесуэльскай і іншай нафтай. Але спецыялісты іх сур'ёзна не ўспрымаюць. Па той простай прычыне, што транспарціроўка "чорнага золата" ў Беларусь робіць нафту з далёкіх краін сапраўды залатой. Такім чынам, на сённяшні дзень эфектыўнага рашэння па выйсці з сітуацыі не знойдзена. Пакуль мы працуем па прынцыпе "ноч прастаяць ды дзень пратрымацца"...

Алег СНОЎ.

ДАРЭЧЫ

У мінулым годзе амаль трэць усіх плацяжоў у рэспубліканскі бюджэт забяспечылі падаткі ад 15 арганізацый.

Галоўныя паступленні, як паведаміла прэс-служба Міністэрства па падатках і зборах, былі ад нафтаперапрацоўкі: ААТ "Нафтан", ААТ "Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод", ЗП "Юнівест-М" (даччынай кампаніі "Роснефти"). Далей ідуць ААТ "Белтрансгаз", РУП "Мінскэнерга", РУП "ВА "Беларуснафта", РУП "ВА "Беларуськалій", ЗП "Лукойл-Беларусь", РУП "Віцебскэнерга", РУП "Гомельэнерга", РУП "Мінск Крышталь", СП ЗАТ "Слаўнафта-Старт", СП ТАА "Мабільная лічбавая сувязь", РУП "Беларускі металургічны завод", ЗП "Слаўнафтахім".

ПОДСЧИТАЛИ

Более половины прогнозных показателей не выполнено

В первом квартале 2007 года Гомельская область не выполнила 13 из 30 прогнозных показателей экономического развития. Об этом было заявлено на заседании облисполкома. Среди невыполненных — показатель роста объемов производства.

Как отмечалось в докладе заместителя председателя облисполкома Владимира Майорова, это связано в первую очередь с уменьшением переработки российского давальческого сырья на Мозырском нефтеперерабатывающем заводе. Для уменьшения влияния одного предприятия на общую ситуацию в регионе решено увеличивать удельный вес частного сектора экономики.

Соб.инф.

Мясаперапрацоўчыя прадпрыемствы падаюць сігнал «SOS»

Так, замежнае прадпрыемства "Інкафуд" (СЭЗ "Брэст") ужо ўтрая скараціла выпуск прадукцыі. Пра гэта ў інтэрв'ю БелаПАН паведаміў першы намеснік дырэктара прадпрыемства Міхаіл Таргоўцаў.

Паводле яго слоў, рашэнне аб прыпыненні імпарту мяса для перапрацоўчых прадпрыемстваў, размешчаных на тэрыторыі свабодных эканамічных зон Беларусі, было прынята 17 сакавіка. Выконваючы гэтае рашэнне, упраўленне ветэрынарыі Мінсельгасхарча накіравала дырэктыву аб прыпыненні ўвозу на пагранічна-ветэрынарныя пункты мяса з Польшчы і іншых дзяржаў на няпэўны тэрмін. Каб падтрымаць рынак, прадпрыемства зараз працуе ў скарочаным рэжыме; запасаў мяса для перапрацоўкі, што засталіся, хопіць дзён на сем-дзесяць.

"Калі забарона на імпарт свініны і мяса птушкі для беларускіх мясаперапрацоўчых прадпрыемстваў не будзе адменена, мы не зможам канкурыраваць на рынках Расіі і Украіны, на якія пастаўляецца да 85% прадукцыі, што вырабляецца намі, — падкрэсліў М.Таргоўцаў. — *Сарвецца таксама праграма нашага выхаду на рынкі Казахстана і Малдовы. Да таго ж за невыкананне кантрактаў да нашага прадпрыемства могуць быць прыменены штрафныя санкцыі"*.

Паводле слоў М.Таргоўцава, прадпрыемства магло б працаваць на айчыннай сыравіне, калі б яна задавальняла па цане, як, да прыкладу, ялавічына, што пастаўляецца "Інкафуду" беларускімі прадпрыемствамі.

"Сёння ні адзін айчынны мясакамбінат не прапануўвае нам свініну танней, чым па 5 тысяч рублёў за кілаграм без уліку ПДК. Набыццё сыравіны па такім кошце закрые для нас замежныя рынкі. Існаваць, працуючы толькі на ўнутраны рынак, які займае каля 15% ад агульнага аб'ёму вытворчасці, мы не зможам", — патлумачыў М.Таргоўцаў.

Паводле слоў М.Таргоўцава, у такой жа сітуацыі апынуліся астатнія пяць мясаперапрацоўчых прадпрыемстваў СЭЗ "Брэст".

Ірына САЗАНОВІЧ.

ПАМЯЦЬ

«Дай курапацкім душам супакой», —

прамаўляў у малітве да Усявышняга ля Крыжа "Пакутнікам Беларусі" ў Курапатах, у дзень памінання памерлых продкаў на Радаўніцу, протаіерэй Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы айцец Леанід Акаловіч. Святар, які правёў тут не адзін малебен і асвячаў усе крыжы, душой і сэрцам прырос да гэтай кроўю палітай мясціны — сімвала пакутнай смерці незлічоных ахвяр бязбожнай сталінскай улады.

А яны не толькі ў Курапатах — палеглыя ад куль крывавых катаў выбітныя грамадска-палітычныя дзеячы, пісьменнікі, кампазітары, навукоўцы, простыя сяляне, што жылі і працавалі з любоўю да роднай зямлі. Толькі ў Мінску і ваколіцах такіх расстрэльных мясцін выяўлена некалькі: у Кальварыі і Цівалях, Благоўшчыне і Лошыцы, лесапарку Ваньковічаў (Чэлюскінцаў). А колькі іх па ўсёй беларускай зямлі і далёка ад яе — на Поўначы, Урале, Сібіры...

Дарэчы, у Курапаты прадстаўнікі грамадскасці прыбылі пасля акцыі памяці ў парку Чэлюскінцаў, дзе ўсклалі кветкі і запалілі свечкі. Агеньчыкі нязгаснай памяці засвяціліся і ў Курапацкім урочышчы ля крыжоў, павязаных вышытымі ручнікамі.

Перад святам сябры Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі — БНФ, іх прыхільнікі і звычайныя грамадзяне ўжо зладзілі некалькі талокаў (яны будуць ісці да новай зімы штосуботу) па навядзенні парадку і чысціні на тэрыторыі Мемарыяла. Добраахвотнікі ўклалі шмат працы, каб усё было дбайна дагледжана. Праўда, сляды пачварнага вандалізму нелюдзяў цалкам ліквідаваць немагчыма. Плача слязамі знявечаны лік Маці Божай Курапацкай на абразе ў каплічцы ля Вялікага Крыжа... Мноства раз разбітая — і зноў складзеная з аскепкаў "лава Клінтана" сведчыць пра нежаданне міліцыі наладзіць дзейсную ахову святыні, афіцыйна ўнесенай у Дзяржаўны рэестр гісторыка-культурных каштоўнасцяў краіны. "Хочаце нармальнай аховы — плаціце!" — не міргнуўшы вокам адказалі ў Мінаблвыканкаме прадстаўнікам грамадскага аргкамітэта па ўвекавечанні памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій.

— У Курапатах павінен быць пантэон, дзе людзі маглі б памаліцца аб закатаваных, пабачыць рэліквіі і дакументы, звязаныя з тым жахлівым часам, — лічыць вядомы гісторык Георгій Штыхаў, бацька якога загінуў у лагеры пад Свярдлоўскам. Памяць пра яго ўвасабляюць Курапаты.

А пакуль малітва ідзе пад соснамі пад нязмоўчны гул "магістралі веку" — МКАД і дарогі з другога боку лясного ўрочышча... З кветкамі падыходзяць да крыжоў новыя і новыя купкі маладзёнаў і старых, якія перажылі на сваім вяку жахі мінулага, сем'і з дзецьмі. На жаль, сярод іх, акрамя Вячаслава Сіўчыка, не было відаць іншых палітычных дзеячаў, лідэраў партый: пэўна, ім, за высвятленнем адносін, зусім не да гістарычнай памяці. Тым больш — практычнага ўдзелу ў добраўпарадкаванні ўрочышча.

Ды памяць жыве!
Чуецца голас святара:
— Няхай жа не будзе дарэмнаю ахвяра бязвінных, няхай на залітай кроўю зямлі нашай больш не будзе гвалту і здзеку. Няхай у нас закрасуе братняя любоў і свеціць сонца волі і шчаснай долі народу нашаму!

* * *

Але няма спакою душам замучаных і зараз. Зноў, ужо праз пару дзён пасля Радаўніцы, мярзотныя нелюдзі распісаліся ў сваім падонстве: зламаны, кінуты на зямлю шэсць асвечаных крыжоў...

А вось як "шчыруюць" над выкарчоўкай памяці — свядома ці несвядома, з нейкай уласнай выгоды — работнікі Ждановіцкага лясніцтва. Пад маркай уборкі колішняга буралому высякаюцца самыя лепшыя, стромкія і моцныя дрэвы, бы святое ўрочышча — звычайная прамысловая дзялянка для вельмі зручнай нарыхтоўкі будматэрыялаў: побач жа магістраль. Новыя прыгажуны — елкі, сосны — пазначаны для вынішчэння чырвона-крывавай фарбай... Як калісьці лепшыя людзі, якія першымі ішлі пад нож дзічэзнай сістэмы.

Тут ужо не проста бяспамяцтва — зацятая, несупынная вайна з чалавечым у чалавеку. Быццам на дварэ не 2007 год, а ўсё той жа, самы крывавы — 1937-ы...

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.

Так выглядае сёння знявечаная "Лава Клінтана".

Народная Воля http://www.nv-online.info
26 КРАСАВІКА 2007 г.

СЛЫШАЛИ?

Три инициативы Воронина

Для того чтобы развиваться, экономика Молдовы нуждается в кардинальных изменениях, заявил президент страны Владимир Воронин. Глава государства выступил сразу с тремя инициативами, которые представил правительству и парламенту.

Еще летом прошлого года, выступая на закрытии весеннелетней сессии парламента, Воронин заговорил о необходимости пересмотра подходов к экономике. Если предыдущие 15 лет независимости государство стремилось доказать, что оно как все, то теперь, акцентировал президент, настала пора реализовать свои преимущества.

Он предложил формировать новую политику по привлечению инвестиций, используя при этом инструменты европейского права. По мнению Воронина, она должна основываться на создании специфического экономического климата, а не на продаже остатков государственного имущества. Тогда глава государства акцентировал внимание на необходимости разумного налогообложения нерезидентов действующих на территории Молдовы, создания механизмов двойной торговой асимметрии — с Евросоюзом и СНГ, а также изменение законодательства в отношении свободных экономических зон.

Глава государства не приемлет больше ситуации, когда в свободных экономических зонах и за их пределами производилась та же самая продукция. "Нам, — заявил Владимир Воронин, — необходимы свободные зоны, с привлекательными условиями для инвесторов, желающих вложить свои деньги в развитие самых современных технологий, в принципиально новые производства".

К сожалению, тогда депутаты ушли на каникулы, а потом, очевидно, появились новые приоритеты, так что прозвучавшие предложения материализовались лишь частично.

Теперь глава государства напомнил о своих инициативах и вдобавок выступил с новыми. Владимир Воронин предложил амнистию капитала, которая должна коснуться всех его форм, включая не только денежные средства, но и недвижимость, ценные бумаги и доли участия в бизнесе. Предполагается, что амнистия будет проводиться на заявительной основе, а за процедуру государство возьмет всего 5% от суммы, которые разделит между госбюджетом и бюджетами медицинского и социального страхования.

Вторая инициатива касается налоговой амнистии для всех видов общегосударственных налогов и сборов, а третья — предусматривает новый подход к налогу на доход от предпринимательской деятельности. Благодаря новым правилам бизнесу предоставится возможность начать все с чистого листа, а существующая 15%-ная ставка переместится теперь с прибыли на дивиденды, и налог с прибыли будет выплачиваться только в тех случаях, когда предприниматели решат направить прибыль на личное потребление. Таким образом будут созданы условия для стимуляции экономической активности, создания новых рабочих мест, а значит, роста занятости населения и повышения заработной платы. Одновременно с этим государство оставляет за собой право увеличить санкции за налоговые нарушения в три раза.

Общество и бизнес положительно отреагировали на инициативы президента. Однако некоторые эксперты, да и политики тоже, задаются вопросом, почему об этих революционных нововведениях заговорили только сейчас. Они беспокоятся и о том, не споткнутся ли революционные реформы о преграды, построенные чиновниками: ведь уже не раз случалось, что хорошие инициативы зависали по причине бюрократических проволочек и препон.

Словно отвечая на эти вопросы, Олег Рейдман, советник президента по экономическим вопросам, объяснил на встрече с бизнесменами, что до сих пор экономическое законодательство и институты были на стадии становления. На данном этапе они тоже еще не достигли совершенства, однако структурная и институциональная части экономики в республике достигли среднеевропейского уровня, а сама ситуация диктует проведение радикальных перемен.

Кроме того, четко определены ожидаемые эффекты. О них заявил сам президент. Говоря о макроэкономических эффектах, среди главных он назвал повышение капитализации экономики страны, активизацию инвестиционного процесса и снижение инфляции. Что касается эффектов в области делового климата, то в качестве результатов ждут снижения объемов теневой экономики, перевода значительной части "черного" наличного оборота в официальный денежный оборот и сокращения поля, на котором возможно развитие коррупции.

Доверие к власти, ответственность перед обществом, прозрачность законодательства и предпринимательская свобода — вот что, по мнению президента Воронина, должно стать символами современной европейской Молдовы.

Людмила БАРБЭ.

Кишинев.

ЧТО НОВОГО?

Какао отлично снижает кровяное давление

Немецкие исследователи из университетской клиники Кельна пришли к выводу, что какао лучше снижает кровяное давление, чем чашка чая.

Группа испытуемых употребляла в течение двух недель продукты, содержащие какао. Это привело к снижению у них кровяного давления в той же степени, что и у группы лиц, принимающих лекарственные препараты для снижения давления. Результаты исследования позволяют предположить, что употребление какао может снижать риск возникновения инсультов и сердечных приступов на 10—20%.

Причина в том, что и чай, и какао содержат полифенолы — класс химических соединений, которые способствуют предотвращению сердечно-сосудистых заболеваний. Но у какао и чая они разные: процианид, содержащийся в какао, является более активным полифенолом.

В настоящее время пациентам с повышенным кровяным давлением настоятельно рекомендуется есть фрукты и овощи, большинство которых богаты полифенолами, хотя на чай и продукты, содержащие какао, приходится большая часть общего объема полифенолов, употребляемых в странах Запада.

Россия начала строить серию плавучих АЭС

Об этом заявил глава Росатома Сергей Кириенко в ходе торжественного начала закладки первой плавучей атомной электростанции в Северодвинске. " Спрос на них есть не только в России, но и в Азиатско-Тихоокеанском регионе, где они могут использоваться для опреснения воды", — сказал Кириенко.

Он подчеркнул, что с началом строительства первой плавучей атомной станции начинается реальное создание серии подобных энергоблоков. Мощность первой плавучей атомной станции, которая будет носить имя академика Ломоносова, составит 70 мегаватт электрической и около 300 мегаватт тепловой. "За этой серией идет следующее поколение — энергоблоки с использованием реакторов атомных подводных лодок мощностью 300—400 мегаватт. За этими проектами стоит огромный объем заказов и работы для ученых и конструкторов", — сказал Кириенко. Плавучая АЭС гораздо безопаснее наземной атомной станции, поскольку имеет несколько уровней защиты.

В ЗЕРКАЛЕ МИРОВОЙ ПРЕССЫ

Демократия дубинок показывает слабость

Жестокость, проявленная российской милицией во время демонстраций оппозиции в Москве и Санкт-Петербурге, стала темой многочисленных комментариев мировой печати.

Австрийская газета **"ЗАЛЬЦБУРГЕР НАХРИХТЕН"** замечает, что кремлевский режим окончательно отворачивается от сообщества западных ценностей и при этом гордится собой.

Польская газета **"ДЗЕННИК"** пишет, что участники демонстрации кричали: "Россия без Путина!", "Не хотим власти чекистов!", а Михаил Касьянов заявил: "Мы хотим изменения власти. Хотим, чтобы выборы в Думу и президентские выборы были свободными, мы не согласны с их жалкой имитацией!" — сообщает газета и добавляет, что независимые комментаторы согласны с тем, что это был показательный урок со стороны Кремля, которым он хотел показать, что в России нет места для антиправительственных выступлений. Владимир Рыжков сказал "Дзеннику", что власть стремится напугать жителей, чтобы те не ходили на демонстрации, а о политике говорили на кухне, как во времена Советского Союза.

Швейцарская газета **"БАЗЛЕР ЦАЙТУНГ"** высказывает такое мнение.

Невероятная жестокость, с которой российская милиция обращалась с участниками небольших мирных демонстраций в Москве и Санкт-Петербурге, кажется удивительной лишь на первый взгляд. Но с точки зрения правящего режима Владимира Путина, она вполне оправданна. Кремль извлек уроки из мирных революций в Грузии и Украине, где после сфальсифицированных выборов демонстрации протеста быстро набрали размах и смели тамошние правительства. Российская власть стремится не допустить разрастания протестов и одновременно запугивает простых граждан. В краткосрочной перспективе такая тактика может принести успех. Но в долгосрочной перспективе подобная стратегия редко оказывалась полезной.

Датская газета **"БЕРЛИНГСКЕ ТИДЕНДЕ"** так оценивает внутриполитическую ситуацию в России.

Нужно быть слепым как крот и неимоверно толерантным, чтобы не замечать, что не все спокойно в государстве российском. За год до выборов, которые должны означать завершение президентских полномочий Путина, он так жестко правит страной, что от демократии в России осталась одна лишь оболочка. А под этой оболочкой скрываются не свобода и плюрализм мнений, а жесткая концентрация власти и преследования политических противников. Евросоюз и США могли бы оказывать на Россию больше давления, чем в настоящее время. Ведь пока Путин может без больших помех осуществлять свои замыслы. Впрочем, Путина, конечно же, невозможно свергнуть с помощью путча. С ним и ему подобными необходимо бороться демократическими средствами.

Эту тему продолжает комментарий из французской газеты **"ФИГАРО".**

Россияне разочарованы годами правления Ельцина, когда на руинах коммунизма царил хаос. В России намного больше россиян испытывают ностальгию по советскому режиму, чем мечтают о демократии по западному образцу. Сильное государство, которое олицетворяет Путин, в ходе референдума наверняка получило бы широкую поддержку. Жестокие действия милиции против демонстрантов не вызовут в России волну возмущения. И все же Кремль демонстрирует неожиданную слабость, столь жестко реагируя на малейшие проявления недовольства.

В комментарии болгарской газеты **"ДНЕВНИК"** читаем.

Столкновения на улицах Москвы и Санкт-Петербурга однозначно показывают, что Кремль предпочитает "демократию полицейских дубинок", которая известна нам из недавнего прошлого и из стран, где правят авторитарные режимы. При этом не важно, почему и как проходят протесты. Достаточно подать голос против режима, чтобы тот обрушился на недовольного всей своей мощью.

Британская газета **"ТАЙМС"** пишет, что поведение Путина ставит перед Западом целый ряд непростых вопросов. В среднесрочной перспективе... мы должны стремиться к тому, чтобы только минимально зависеть от поставок российского газа. В ближайшей перспективе нам надо решить, как реагировать, если Гарри Каспаров превратится в мученика демократии. Но еще важнее вопрос о том, как нам лучше позаботиться о тех российских диссидентах, которым было предоставлено надежное убежище в наших странах.

Радио **"НЕМЕЦКАЯ ВОЛНА"** отмечает, что официальный Берлин назвал разгон демонстраций в Москве и Петербурге неоправданным проявлением насилия и потребовал от Кремля провести расследование. Представители крупнейших политических партий Германии подвергли резкой критике расправу над участниками "Маршей несогласных". Член ХДС Эльмар Брок , возглавляющий в Европарламенте комитет по внешней политике, заявил: "В России исчезают последние признаки демократии. Такие люди, как Гарри Каспаров, — это не радикалы, а умеренные политики". Эльмар Брок призвал ЕС прореагировать на события в Москве и Санкт-Петербурге.

Эксперт по внешней политике партии СДПГ Рольф Мютцених считает, что российские власти переступили границу дозволенного.

ПОЧТИ ФАНТАСТИКА

Препараты для ума

Звучит как научная фантастика: новое поколение фармацевтических средств, которые будут делать людей умнее. Но именно такие вещества смогут в будущем принимать студенты и предприниматели, чтобы сдать экзамен или лучше справиться с той или иной работой.

Государственный исследовательский институт Forsight полагает, что "когнитивные усилители" могут в ближайшие два десятилетия стать "распространенными, как кофе". Они помогут людям быстрее думать, легче расслабляться и лучше высыпаться, сообщает Daily Telegrach.

Британское Министерство здравоохранения было настолько обеспокоено возможностью появления таких средств, что поручило Академии медицинских наук оценить возможные последствия применения этих веществ.

Часть из них в Великобритании используется для лечения нарколепсии или острой усталости. В США их уже нелегально покупают через Интернет те, кто надеется с помощью подобных средств лучше справляться с нагрузкой в классе или в офисе.

Недавно исследователи из Кембриджского университета провели изучение эффектов модафинила — лекарства, которое доступно в Великобритании людям, произвольно впадающим в сон. Ученые обнаружили, что он существенно улучшает работоспособность.

В течение двух часов после принятия препарата здоровые добровольцы лучше запоминали последовательность чисел, были менее импульсивны и демонстрировали лучшую краткосрочную память.

Помимо препаратов, доставляющих удовольствие и активизирующих половую жизнь, в исследовании Foresight было упомянуто о возможности создания средств, вызывающих избирательную потерю памяти. Например, можно забыть факт взрыва бомбы — так называемые бета-блокираторы смягчают воспоминания о стрессовых ситуациях.

НОВИНКА

Сверхэкономичный

Компания Volkswagen разрабатывает автомобиль, средний расход топлива которого составит один литр на сто километров пути. Новая модель будет запущена в производство через четыре года.

Об этом в интервью немецкому изданию Brauschweiger Zeitung сообщил председатель наблюдательного совета Volkswagen Фердинанд Пих, передает Motorauthority.com.

В 2002 году немецкий концерн впервые представил сверхэкономичный автомобиль — 1-litre car. Машина была оснащена 0,3-литровым одноцилиндровым дизельным мотором мощностью 8,5 лошадиных сил, который расходовал 0,89 литра топлива на сто километров. Однако в 2005 году этот проект был заморожен из-за слишком высокой стоимости прототипа — 35 тысяч евро. Теперь, по словам Пиха, компании удастся снизить себестоимость до пяти тысяч евро, благодаря применению менее дорогих материалов, поэтому Volkswagen снова приступает к созданию подобной машины.

ЛЮБОПЫТНО

В России появился первый поезд для венчания

В России появился первый "Свадебный поезд", в котором можно обвенчаться в ходе брачного путешествия. Такую услугу предоставляет Октябрьская железная дорога и компания "РЖД Тур", говорится в пресс-релизе "Российских железных дорог".

В составе поезда два вагона ресторана, вагон-храм, штабной вагон, вагон для развлекательных мероприятий и вагон-салон. Молодоженам предоставлено купе вагона "Гранд де Люкс". Поезд рассчитан на 100 пассажиров.

Октябрьская железная дорога предоставляет поезд, а "РЖД Тур" организовывает программу тура. Она предусматривает сотрудничество с транспортными агентствами, отелями, экскурсионными бюро, ресторанами и компаниями по организации праздников.

Самые счастливые

Исследователи из Университета Кембриджа признали жителей Дании самыми счастливыми в Европе, пишет газета Daily Mail. Ученые опросили 20 тысяч человек из 15 европейских стран, предложив им оценить по десятибалльной шкале степень удовлетворенности личной и общественной жизнью.

Так, своим семейным положением, друзьями и работой больше всего довольны датчане — в рейтинге они получили 8,3 балла. Исследователи также учли и высокую степень доверия жителей Дании к своему правительству, правоохранительным органам и судебной системе.

Следом за Данией идут жители Финляндии, затем Ирландии и Швеции, замыкает пятерку самых счастливых стран Голландия. Великобритания оказалась на девятом месте с 7,47 балла, через строчку после нее идут Франция и Германия. Наименее счастливыми, по мнению университетских исследователей, оказались жители Италии.

Напомним, в исследовании социального психолога из британского университета Лестера Эдриана Уайта, который в 2006 году создал "Мировую карту счастья", Дания из 178 стран мира также заняла первое место по уровню счастья. Другие исследователи отдавали предпочтение Мальте и Вануату.

ФОТОВЗГЛЯД

Оперные певицы решили спеть в знак протеста против замены портрета сэра Эдварда Элгара на портрет Адама Смита на купюре в 20 фунтов.

Общественные организации создают в Британии "Министерство здравого смысла", чтобы обратить внимание людей на случаи кражи личных данных.

Фидель Кастро «провел официальную встречу»

На Кубе государственное телевидение сообщило о том, что Фидель Кастро провел переговоры с представителем китайского руководства. Это, по всей видимости, была первая официальная встреча Фиделя Кастро после перенесенной в июле прошлого года операции на кишечнике.

Фидель Кастро, который временно передал власть своему брату Раулю, судя по всему, в последние несколько недель стал больше участвовать в политической жизни Кубы. Недавно президент Венесуэлы Уго Чавес заявил, что Фидель Кастро "почти полностью поправился". Члены кубинского правительства также выражают надежду, что он полностью выздоровеет.

Еще ранее глава Национальной ассамблеи Кубы Рикардо Аларкон заявил, что состояние здоровья президента Фиделя Кастро позволит ему баллотироваться на парламентских выборах весной следующего года. Заявление главы кубинского парламента прозвучало на встрече с депутатами, посвященной подготовке к мартовским выборам 2008 года. На них должны быть выбраны депутаты, которые в свою очередь выберут главу госсовета Кубы — этот пост Фидель Кастро занимает с 1976 года. *"Я бы объявил его кандидатом. Я уверен, что он будет в отличном состоянии, чтобы продолжать выполнение своих полномочий"*, — заявил Аларкон.

80-летний Кастро, который возглавляет Кубу с 1959 года, передал власть своему брату Раулю в середине прошлого года на время проведения операции на кишечнике и реабилитации после нее.

Аларкон заявил, что в последнее время неоднократно общался с президентом. По словам главы парламента Кубы, несмотря на передачу власти своему брату, Кастро никогда *"не прекращал выполнять свои обязанности"*.

ПАМЯТЬ

Марш Живых

В Польше прошел традиционный Марш Живых от бывшего нацистского лагеря смерти Освенцим (Аушвиц) до соседнего лагеря Бжезинка (Биркенау). В нем приняли участие около 8 тысяч человек.

Ежегодно так называемой Дорогой смерти идет еврейская молодежь со всего мира, а также около тысячи молодых поляков. Молодые люди прибыли в бывшие гитлеровские концлагеря, чтобы почтить память жертв Холокоста и выступить с обращением ко всем в мире, чтобы самая страшная трагедия в истории человечества никогда не повторилась. Молодежь, одетая в голубые куртки, прошла в молчании 3-километровую трассу, по которой когда-то узники бывших гитлеровских лагерей шли на смерть.

Марш Живых традиционно начался с сигнала шофара — сделанного из бараньего рога древнего духового музыкального инструмента, в который трубят во время богослужения в синагогах на еврейский Новый год. В заключении марша произнесен кадиш — поминальная еврейская молитва. Участники громко произнесли имена своих близких, которые погибли от рук гитлеровцев в газовых камерах.

Марши Живых в Польше с 1988 года проводит израильское Министерство образования в сотрудничестве с общественной организацией March of the Living International. Начиная с 1996 года акция проходит каждый год. Традиционно евреи со всего мира перед маршем посещают экспозицию музея в Освенциме, обращая особенное внимание на экспозицию так называемого блока смерти и стены расстрелов. Кульминационным моментом марша является совместная поминальная молитва, а затем исполнение "Хатиквы" — гимна Израиля.

Самое массовое шествие состоялось в 2005 году, в 60-ю годовщину освобождения Освенцима. Тогда в нем приняли участие около 20 тысяч человек, а колонну тогда возглавляли премьер-министры Польши и Израиля Марек Белька и Ариэль Шарон.

"Мы встречаемся прежде всего даже не для того, чтобы вспомнить именно участников героического восстания в гетто, а чтобы еще раз напомнить о страшной трагедии — геноциде еврейского народа, уничтожении миллионов евреев", — говорит Станислав Краевский — председатель международной общественной организации Совет христиан и евреев.

Радио Свобода напоминает, что концлагерь Освенцим-Бжезинка был построен в 1940 году. Первыми его узниками были поляки. Кроме трех основных зон комплекс включал до 40 лагерей-спутников меньшего размера. Как показал на Нюрнбергском процессе последний комендант лагеря, в его стенах погибло три миллиона человек. В лагерь свозили евреев со всей оккупированной Европы, а также поляков, цыган и советских военнопленных.

Иван МАКАЛОВИЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
26 КРАСАВІКА 2007 г.

СІТУАЦЫЯ

Тэлефоннае бяспраўе

У адзін з панядзелкаў сотні жыхароў Віцебска ў роспачы адчулі сябе пазбаўленымі тэлефоннай сувязі і таму — бездапаможнымі. Так было і з тымі, хто меў сувязі "наверсе" мясцовай улады і звычку да праславутага "тэлефоннага права".

Амаль пяць гадзін запар, з 9-ці раніцы, у горадзе панавала тэлефоннае бяспраўе. Былі заблакаваныя нумары на "двойку" і нават экстраныя, на "адзінку" — "101", "102", "103", "104". Нельга было паведаміць пра пажар, выклікаць міліцыю, "хуткую дапамогу" і аварыйную службу гаргаза. На зразумелае ў такой сітуацыі тэлефанаванне ў даведачную ("109") гучаў стэрэатыпны магнітафонны адказ: "Напрамак перагружаны, патэлефануйце пазней".

Каля 10 гадзін некаторую яснасць унёс дзяжурны УКДБ, нумар якога адказаў, бо пачынаецца на "тройку". *"У сувязістаў нейкая аварыя на станцыі, абяцаюць праз гадзіну выправіць. Чакайце..."*

Але сувязь аднавілася толькі пасля 14 гадзін, пра што паведаміла мясцовае радыё — тым, у каго яно ўключана пастаянна. Астатнія нерваваліся, марна гвалтуючы тэлефонныя апараты.

Хацелася б верыць, што за пяць трывожных гадзін ніхто ў Віцебску не пацярпеў ад пажару, не памёр у чаканні сувязі са станцыяй "Хуткай дапамогі", не быў пакрыўджаны злачынцамі.

А яшчэ хацелася б верыць, што сувязісты здагадаюцца самі распавесці ў СМІ, што і чаму ў іх здарылася і што будзе зроблена, каб сітуацыя не паўтарылася.

Міжволі напрошваецца думка: кепска, калі сувяззю займаецца манапаліст — адзіная дзяржаўная структура. Было б іх некалькі (у тым ліку — прыватныя) з роўнымі магчымасцямі, яны б спрачаліся паміж сабой, змагаліся за кліентаў надзейнасцю і адказнасцю, а не адпалохвалі б народ усё большымі тарыфамі, частай зменай нумароў і аварыйнымі адключэннямі, за якія ніхто не просіць прабачэння. Канкурэнцыя прымусіла б сувязістаў загадзя паклапаціцца аб рэзервных экстраных нумарах, няхай сабе — і мабільных, пра якія паведамлялася б не па радыё, а па тэлефоне ў тым жа рэжыме аўтаадказу. І — без хлусні наконт "перагрузкі", а сумленнымі словамі: "Выбачайце, у нас —аварыя!".

Няшчырасць і марудлівасць віцебскіх сувязістаў — вынік іхняй манаполіі, адсутнасці канкурэнцыі на рынку электрасувязі і выбару ў нас, абанентаў.

А калі ў чалавека няма выбару, ён бяспраўны і бездапаможны. Разумеючы гэта, манапаліст пачувае сябе недатыкальным і беспакараным. Толькі ён заўжды мае рацыю, а не спажывец ягоных паслуг.

Так у нас не толькі з сувяззю, але і з прэсай, і з тэлебачаннем, і з друкарнямі, і з мясцовым кіраваннем.

Бяры, што даюць і будзь удзячны, а то і гэта адбяруць.

Менавіта жаданне мець права выбару прымусіла народы развітых краін аддаць галасы за дэмакратыю. За той грамадскі лад, пра які У.Чэрчыль сказаў: *"Дэмакратыя — даволі брыдкая рэч, але нічога лепшага чалавецтва дасюль не прыдумала"*.

Вось да чаго можна дадумацца ў адсутнасці сувязі. І ў гэтым, бадай, адзіны "плюс" пяцігадзіннага "тэлефоннага бяспраўя" ў Віцебску.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ВОПЫТ

Адзін супраць сістэмы

Змаганне нават аднаго чалавека супраць бюракратычнай машыны часам прыносіць плён. Індывідуальны прадпрымальнік з Жодзіна (Мінская вобласць) Мікалай Горбач адчуў на ўласным вопыце моц і непрабівальнасць бюракратычнай сцяны. Толькі праз чатыры гады (!) ад пачатку змагання за права па-чалавечы працаваць прадпрымальнік чагосьці дабіўся: 5 сакавіка 2007 года ГУУС Жодзіна ўзбудзіла крымінальную справу супраць мясцовых чыноўнікаў за чыненне перашкод у прадпрымальніцкай дзейнасці.

Апошні працоўны год

ІП з Жодзіна Мікалай Горбач чатыры гады ваюе з мясцовай вертыкаллю за права працаваць вадзіцелем маршрутнага таксі. Апошнім працоўным годам для прадпрымальніка стаў 2005-ы, пасля якога мясцовыя "Аўтапарк №18" і Жодзінскі гарвыканкам не працягнулі з ІП дамову на перавозку пасажыраў. Датуль гады тры прадпрымальнік змагаўся супраць самаўпраўства жодзінскіх чыноўнікаў самастойна. Безвынікова. І толькі цягам апошняга, 2006-га, года да працэсу падключыліся пракуратура, міліцыя, суды.

Палкі ў калёсы Мікалаю Горбачу ўлады пачалі ставіць ў 2002 годзе. Прычым не толькі М.Горбачу, але і астатнім ІП, якія перавозяць пасажыраў. Рэальныя абрысы канфлікт набыў пасля 20 студзеня 2004 года, калі жодзінская вертыкаль пад кіраўніцтвам намесніка старшыні гарвыканкама Аляксандра Ізафатава пры сакратары Наталлі Каралёнак, яна ж — эканаміст аддзела эканомікі, членах камісіі: начальніку аддзела эканомікі Дзмітрыю Сідараву (цяпер — намеснік старшыні Жодзінскага гарвыканкама), і Сяргею Падпорынаву — інспектару транспартнай інспекцыі, — правялі конкурс на права перавозіць пасажыраў. Жодзінскі гарвыканкам "стварыў штучную канкурэнцыю", запрасіўшы да ўдзелу ТАА "Сімвал".

У конкурсе ўдзельнічалі 9 перавозчыкаў — усе 9 атрымалі маршруты; "Сімвал" таксама атрымаў маршруты, атрымаў уласны маршрут і Аляксандр Гігель, які на той час знаходзіўся ў зняволенні (!). І толькі пасля скандалу, учыненага перавозчыкамі, прозвішча зняволенага са спісу "ўбралі".

З выніковага (чытай: афіцыйнага) пратакола М.Горбач даведаўся, што на восем месцаў канкурэнцыі на рынку электрасувязі і выбару ў нас, абанентаў. 10 перавозчыкаў плюс ТАА "Сімвал"; восем атрымалі маршруты, а яшчэ для трох перавозчыкаў камісія ўвяла дадатковыя маршруты. Усім канкурсантам дасталося па асобным маршруце. Менавіта таму ва ўсіх далейшых дзеяннях Мікалай Горбач прытрымліваецца думкі, што конкурс насіў незаконны характар.

Жодзінскі гарвыканкам заключае з Мікалаем Горбачам дамову на перавозку пасажыраў — з 1 сакавіка 2004 года па 30 красавіка 2004 года. Апошні, трэці па ліку, дагавор, ахоплівае перыяд з 1 студзеня 2005 года па 31 снежня 2005 года. Год 2005-ы стаў для прадпрымальніка апошнім працоўным годам.

Старых перавозчыкаў кінулі?

4 красавіка 2005 года праводзіцца конкурс №2 па пасажырскіх перавозках. Ён праходзіць без удзелу Мікалая Горбача і некаторых іншых "старых" перавозчыкаў. Вядома, ніхто не падаваў заявак на ўдзел у конкурсе — спіс "канкурсантаў" вызначаны на першым конкурсе. Пераможцам прызнаная фірма "Сімвал", якая і заключыла з Жодзінскім гарвыканкамам дамову на перавозку пасажыраў па рэгулярных маршрутах.

У Гаспадарчым судзе Мінскай вобласці прадстаўнікі Жодзінскага гарвыканкама "неаднаразова ўказвалі на тое, што ў 2005 годзе конкурс не праводзіўся, аднак чамусьці ўжо пасля вынясення 14.09.2006 года рашэння ў матэрыялах справы з'яўляецца пратакол №2 ад 04.04.2005 года, які сведчыць пра тое, што ўсё-такі ў 2005 годзе конкурс быў. З гэтай нагоды 26.10.2006 года была пададзена ў апеляцыйную інстанцыю заява пра падложнасць доказу, які ні 26.10.2006 года, ні 14.11.2006 года так і не быў даследаваны і вырашаны", — пісаў пазней прадстаўнік прадпрымальніка.

Узнікае лагічнае пытанне: а ці быў конкурс №2? Суды не даследавалі належным чынам праблему — адказу на пытанне не далі.

Каму — права, а каму — бяспраўе

За колькі дзён да заканчэння тэрміну дзеяння апошняй дамовы на пасажыраперавозкі — 27 снежня 2005 года М.Горбач звяртаецца ў Жодзінскі гарвыканкам з просьбай працягнуць тэрмін дзеяння дамовы. А.Ізафатаў паведамляе, што рашэннем гарвыканкама "Аб устанаўленні аператара аўтамабільных перавозак на гарадскіх і прыгарадных маршрутах горада Жодзіна" ад 25 жніўня 2005 года аператарам вызначаны "Аўтапарк №18", куды і трэба звяртацца. Але Жодзінскі гарвыканкам не надзяліў аўтапарк правам працягваць (менавіта працягваць: ІП меў дамову з гарвыканкамам, і тэрмін яе дзеяння яшчэ не скончыўся, — а не заключаць новую) дамову.

Гарвыканкам і аўтапарк пачалі "перапасоўваць" прадпрымальніка адзін аднаму, як мяч на футбольным полі.

"Неабходнасць заключаць новую дамову адсутнічала, бо тэрмін дзеяння папярэдняй дамовы не скончыўся. Больш за тое, бакі ўзгаднілі магчымасць працягнення дамовы на падставах, выкладзеных вышэй", — пісаў пазней прадстаўнік.

Такім макарам Жодзінскі гарвыканкам паступіў і з іншым перавозчыкам — Уладзімірам Сідаравым. Зроблена гэта 26 снежня 2005 года — за дзень да таго, як Мікалай Горбач прыйшоў да А.Ізафатава ў гарвыканкам па той жа праблеме. Аднак дамова з адным працягнутая, з другім — Мікалаем Горбачам — не.

Аператар, на думку прадстаўніка, якая пазней неаднаразова выказвалася ў судах, увогуле "не меў права ні працягнуць дзеючую дамову, ні заключыць новую дамову на права ажыццяўляць ІП Горбачам М.І. перавозкі па маршруце №5". Толькі марна ўсё. Да слова: большасць удзельнікаў першага конкурсу дагэтуль перавозяць пасажыраў, хаця пасля 2004 года конкурсаў з іхнім удзелам не праводзілася.

Чыноўніцкая перапасоўка

"Не згодны з рашэннем А.Е.Ізафатава, я 09.01.2006 года паўторна звярнуўся да старшыні Жодзінскага гарвыканкама В.М.Кашэўскага, аднак у канцы студзеня 2006 года атрымаў аналагічны адмоўны адказ, падрыхтаваны А.Е.Ізафатавым.

...Я двойчы на працягу лютага 2006 года, а затым — і ў маі звяртаўся ў вуснай форме (на прыёме) да новапрызначанага старшыні гарвыканкама. Аднак станоўчага выніку не дабіўся", — пісаў пазней М.Горбач у іску ў Гаспадарчы суд Мінскай вобласці.

Між тым 13 сакавіка 2006 года Жодзінскі гарвыканкам зноў збіраў перавозчыкаў. Пра тое Мікалай Горбач даведаўся праз два дні, 15 сакавіка, і ў той жа дзень накіраваўся да дырэктара "Аўтапарка №18" Ірыны Саладухі. З-за яе "занятасці" на прыём трапіў толькі 17 сакавіка. Два з паловай месяцы без працы не прайшлі для прадпрымальніка незаўважанымі: на ўтрыманні М.Горбача знаходзіліся двое дзяцей і пажылы бацька, які пражывае ў Барысаве. Пра гэта прадпрымальнік расказаў у лісце да старшыні гарвыканкама.

"Працяглы час я не мог ажыццяўляць пасажыраперавозкі з-за адсутнасці дамовы і не меў магчымасці матэрыяльна забяспечваць сваю сям'ю, таму я мусіў прыслухацца да рэкамендацый выканкама і звярнуўся да дырэктара ДУП "Аўтапарк №18" І.Б.Саладухі. Калі зайшоў да яе на прыём, яна сказала: "Уся дакументацыя на прыватных перавозчыкаў знаходзіцца ў У.В.Бялова, звярніцеся да яго". Я зайшоў да Бялова і атрымаў наступны адказ: у нас ёсць дакумент за подпісам начальніка Транспартнай інспекцыі па Мінску і Мінскай вобласці... і на падставе гэтага дакумента мы не працягнем з вамі адмову, дый маршруты ўжо ўсе раздадзеныя", — адзначыў Мікалай Горбач.

Пра які дакумент начальніка транспартнай інспекцыі па Мінску і Мінскай вобласці ідзе гаворка? Цытуем: "У выніку праведзенай работы сумесна з Жодзінскім выканаўчым камітэтам дамовы заключылі наступныя перавозчыкі: Гігель Генадзь Еўдакімавіч, Гігель Аляксандр Генадзьевіч, Гігель Анатоль Генадзьевіч, Бычкоў Канстанцін Канстанцінавіч, Сідараў Уладзімір Мікалаевіч, Нарушэвіч Віталь Дзмітрыевіч, ТАА "Сімвал". У сувязі з незаключэннем ІП Горбач М.І. і ІП Бычковым А.К. дамоў з аператарам аўтамабільных перавозак, г.зн. "Аўтапаркам №18", Жодзінскаму выканаўчаму камітэту рэкамендавана скасаваць дамовы на перавозку пасажыраў з названымі ІП".

Гэтая папера за подпісам начальніка Транспартнай інспекцыі па Мінску і Мінскай вобласці Алега Якшэвіча ў аўтапарк №18 і РУП "Мінскаблаўтатранс" датавана 29 снежня 2005 года. Мікалай Горбач звяртаўся да А.Ізафатава з просьбай працягнуць дзеянне дамовы двума днямі раней — "дакумента", на падставе якога аўтапарк №18 "кінуў" прадпрымальніка, яшчэ не было ў прыродзе.

Што ж адбываецца далей? Каб не быць галаслоўнымі, ізноў працытуем заяву Мікалая Горбача на імя Аляксандра Ізафатава ад 26 мая 2006 года. Гаворка ідзе пра візіт прадпрымальніка ў аўтапарк №18.

"Я запытаў, каму аддадзеныя маршруты і на якой падставе, калі А.Г.Гігель увогуле не ІП, а К.К.Бычкоў не мае ліцэнзіі на права перавозак пасажыраў. Пасля таго я паказаў яму пратакол пасяджэння конкурснай камісіі, Бялоў выйшаў з кабінета і пайшоў у прыёмную І.Б.Саладухі. Пасля вяртання прапанаваў мне маршруты №№3, 7. Ад прапановы я адмовіўся, таму што выдзеленага мне маршруту №5 мяне ніхто не пазбаўляў".

Замест адказу на пастаўленыя пытанні вертыкаль, не знаходзячы іншых аргументаў, проста спыняе перапіску з прадпрымальнікам. Кола замкнулася. Засталося ісці ў суд.

Хаджэнні па судах

Хаджэнні па судах пачынаюцца з 1 жніўня 2006 года, калі Мікалай Горбач падае іск у Гаспадарчы суд Мінскай вобласці. Ісцец просіць суд прызнаць дзеянні Жодзінскага гарвыканкама незаконнымі і абавязаць мясцовую вертыкаль працягнуць дамову на пасажырскія перавозкі па маршруце №5. Пасля адмовы Гаспадарчага суда Мінскай вобласці Мікалай Горбач ідзе ў Вышэйшы Гаспадарчы суд.

11 студзеня 2007 года і ВГС адмовіў задавальняць патрабаванні прадпрымальніка. Мікалай Горбач рыхтуе скаргі.

За самаўпраўства прыйдзецца адказваць

Гаспадарчыя спрэчкі — прэрагатыва гаспадарчых судоў, а вось дзеянні Жодзінскага гарвыканкама і аўтапарка №18, якія Мікалай Горбач называе "незаконнымі", — ужо з другой оперы.

5 снежня 2006 года Мікалай Горбач, стомлены блуканнем па чыноўніцкіх кабінетах і судах, накіроўвае начальніку Жодзінскага ГУУС і пракурору горада заяву. Прадпрымальнік угледзеў у дзеяннях службовых асоб гарвыканкама і аўтапарка №18 прыкметы злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 232 (перашкоды прадпрымальніцкай дзейнасці) і 426 (злоўжыванне службовым становішчам) Крымінальнага кодэкса.

"Злоўжываючы службовым становішчам, з прычыны асабістых непрыязных адносін, што ўзніклі з-за занятай мною прынцыповай і крытычнай пазіцыі ў адносінах да арганізацыі перавозак маршрутнымі таксі, а затым, падчас правядзення конкурсу па размеркаванні маршрутаў, якія яны правялі з парушэннем заканадаўства, чыняць перашкоды мне на працягу доўгага часу ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць, а менавіта: нематывавана адмаўляюць мне ў працягненні ці заключэнні дамовы на перавозку пасажыраў па маршруце №5, пра якія я выйграў у выніку конкурсу, праведзенага ў 2004 годзе", — напісаў у заяве Мікалай Горбач. Прадпрымальнік лічыць, што чыноўнікі нанеслі яму ўрон у суме 9 мільёнаў рублёў.

Праз тры месяцы, 5 сакавіка 2007 года, ГУУС Жодзіна ўзбудзіла крымінальную справу па артыкуле 232 "Перашкоды прадпрымальніцкай дзейнасці" ў адносінах да дырэктара аўтапарка №18 Ірыны Саладухі і яе былога намесніка Уладзіміра Бялова.

Працяг будзе?..

Генрых СТАХОЎСКІ.

РЭГІЁН

Злодзей варты не баіцца

Аршанскі райаддзел унутраных спраў з прэтэнзіяй звярнуўся да кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў: або ўмацуйце запоры сваіх складоў, або павялічце заробкі вартаўнікоў, каб заахвоціць іхнюю пільнасць. Для міліцыі гэтае пытанне надзвычай актуальнае, бо яна стамілася ад бясплённых пошукаў злодзеяў і скрадзенага імі дабра...

Супрацоўнікі Аршанскага РАУС не без здзіўлення заўважылі, што ад колькасці вартаўнікоў захаванасць маёмасці гаспадарак не залежыць. Насупраць: больш вартаўнікоў — больш крадзяжоў. Ці то злодзеям карціць залезці менавіта ў забяспечаную шматлікай вартай гаспадарку дзеля "спартыўнага" імпэту, ці то вялікая колькасць вартаўнікоў пераконвае зламыснікаў у наяўнасці на складзе нечага сапраўды каштоўнага, што мае сэнс красці. Ва ўсялякім разе пры стабільнай колькасці вартаўнікоў колькасць крадзяжоў таксама або застаецца стабільнай, або паступова расце, гэта і навяло міліцыю на думку, што вартаўнікі не зацікаўленыя ў захаванасці каштоўных механізмаў і матэрыялаў.

У кожным з 23 сельгаспрадпрыемстваў Аршаншчыны ёсць пры складах і мехдварах начныя вартаўнікі. Тым не менш колькасць крадзяжоў трымаецца на высокім узроўні: летась іх было 36, а сёлета ўжо за першыя тры месяцы зафіксавана 14, так што мінулагоднее дасягненне, відаць, будзе пераўзыдзена.

Бяруць зладзеі ўсё, што можна прадаць. З ахоўваемага склада эксперыментальнай базы "Вусце" ноччу, зрэзаўшы навясныя замкі, злачынцы вынеслі ядахімікатаў на 20 мільёнаў рублёў. А з мехдвара сельгаспрадпрыемства "Заднепроўскае", дзе таксама наладжана ахова ў начны час, угналі МАЗ, у баку якога было 50 літраў паліва. Ні хімікаты, ні грузавік дасюль не знойдзеныя. Міліцыянеры — у роспачы і ва ўсім вінавацяць адміністрацыю гаспадарак, якая, маўляў, шкадуе грошай на сучасныя запоры і захвочванне вартаўнікоў...

Ціхай смерці не атрымалася

Магутным выбухам і цяжкімі траўмамі абярнулася спроба маладой жанчыны з Віцебска скончыць жыццё самагубствам.

23-гадовая жанчына пражывала без прапіскі ў аднапакаёвай кватэры пяціпавярховага дома ЖБК па вуліцы Лазо разам з двухгадовым дзіцем. Муж маладой маці знаходзіцца ў турме, сама яна не працуе і, паводле сведчанняў суседзяў, вызначаецца амаральнымі паводзінамі. Спрабуючы атруціцца, яна, як вызначыла папярэдняе следства, абрэзала нажом гнуткі шланг, што падводзіць газ да кухоннай пліты, а потым вырашыла запаліць цыгарэту. Калі маладзіца пстрыкнула запальнічкай, газава-паветраная сумесь выбухнула і загарэлася.

Пачуўшы грукат, на месца выбуху паспяшаліся старшыня і бухгалтар ЖБК, якія жывуць у тым жа кааператыўным доме. Яны адразу ж выклікалі міліцыю, ратавальнікаў і "хуткую дапамогу", а пакуль апошняя прыбыла, патушылі агонь, якім была ахоплена самазабойца.

На шчасце, у момант выбуху дзіцяці ў кватэры не было. Выбухам разбурыла перагародку паміж кухняй і жылым пакоем, але суседнія кватэры і людзі ў іх не пацярпелі.

Моцна пацярпела няўдалая самазабойца. Яе з апёкамі 85% цела даставілі ў бальніцу. Урачы намагаюцца захаваць ёй жыццё, ад якога яна так хацела пазбавіцца...

Сяргей БУТКЕВІЧ.

АТЫ-БАТЫ

Узяў шынель, пайшоў дамоў

Мінскім міжгарнізонным ваенным судом да шасці гадоў пазбаўлення волі прыгаворана радавы аднаго з пагранічных атрадаў за тое, што пакінуў месца службы, парушыў правілы нясення пагранічнай службы, а таксама за крадзеж агнястрэльнай зброі.

Вайсковец, знаходзячыся ў нарадзе па ахове дзяржаўнай мяжы, пакінуў месца нясення ваеннай службы і выкраў пры гэтым выдадзены яму аўтамат і баявыя патроны. У выніку вышуковых мерапрыемстваў ён быў затрыманы ваеннаслужачымі пагранічных войскаў і прадстаўнікамі праваахоўных органаў у пуні на ўскраіне адной з вёсак Гродзенскай вобласці. Выкрадзеная зброя і боепрыпасы да яе канфіскаваныя.

Ваенным пракурорам па наглядзе за законнасцю на дзяржаўнай мяжы і ў пагранічных войсках па выніках расследавання крымінальнай справы ўнесена прадстаўленне камандзіру часці аб ліквідацыі прычын і ўмоў, якія садзейнічалі ўчыненню гэтага злачынства. Па выніках яго разгляду пяць службовых асоб прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

ЗДАРЭННІ

Мардовія на Беларусь: масавая бойка ў расійскай сталіцы

Бойка адбылася ў раёне Сонцаўскага аўтамабільнага рынку. Паводле інфармацыі прэс-службы, усе ўдзельнікі бойкі знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення і цяпер не могуць успомніць, што паслужыла прычынай сутыкнення.

Адзін пацярпелы, 22-гадовы беларус, у цяжкім стане дастаўлены ў рэанімацыйнае аддзяленне Боткінскай бальніцы. Яго стан на момант падрыхтоўкі гэтага матэрыялу заставаўся крытычным. Расійскія СМІ паведамляюць аб затрыманні двух мужчын, 28 і 30 гадоў, якія жылі ў Маскве на працягу месяца без рэгістрацыі. Па некаторых звестках, абое — грамадзяне Расіі. Па факце бойкі паміж беларусамі і жыхарамі Мардовіі распачата крымінальная справа на падставе артыкула 111 Крымінальнага кодэкса Расіі (наўмыснае прычыненне цяжкага ўрону здароўю).

Таццяна КАРАВЯНКОВА.

ПРАШУ СЛОВА!

Дабраліся і да пенсіянераў

Пасля павышэння тарыфаў на энерганосьбіты Аляксандр Лукашэнка і ўрад сталі шукаць крыніцы папаўнення дзяржаўнага бюджэту, каб залатаць "дзіркі". Адразу ж па ўсім перыметры падняліся тарыфы на квартплату, электраэнергію, праезд ва ўсіх відах аўтатранспарту і чыгунцы. Дабраліся нават да бедных пенсіянераў.

Як вядома, з першага студзеня А.Р.Лукашэнка падпісаў указ, згодна з якім санаторна-курортнае лячэнне пенсіянераў стала платным. Цяпер за пуцёўку ў здраўніцу Міністэрства сацыяльнай аховы трэба плаціць 15 працэнтаў ад даходу, а дакладней ад атрымліваемай пенсіі. Гэта прыкладна крыху больш за сто тысяч рублёў пры ўмове, што пенсія ў межах 300 тысяч рублёў. Праўда, ільгота засталася для інвалідаў вайны, а таксама для тых, хто мае першую і другую групы інвалідзнасці. Гэта паўбяды, бо і на самай справе, калі размеркаваннем санаторных пуцёвак займаліся сацыяльныя аддзелы райвыканкамаў, дапускалася шмат парушэнняў. Асобныя "хворыя" з ліку пенсіянераў, карыстаючыся блізкімі адносінамі з размеркавальнікамі, а дакладней "блатам", маглі двойчы ў год выязджаць на санаторнае лячэнне, у той час, як іншыя маглі стаяць у чарзе на атрыманне доўгачаканай пуцёўкі 2—3 гады. Я асабіста толькі праз тры гады з хвосцікам атрымаў пуцёўку ў санаторый "Вяжуцкі". Таму стварэнне рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні насельніцтва і па распаўсюджванні санаторных пуцёвак можна было толькі вітаць, бо меркавалася, што стане больш парадку і дысцыпліны, знікнуць "халяўшчыкі", а санаторныя пуцёўкі будуць атрымліваць у першую чаргу тыя, хто асабліва мае патрэбу ў лячэнні. Ва ўсякім выпадку рэгіянальныя цэнтры, створаныя ў райцэнтрах, пакуль і прытрымліваюцца справядлівага размеркавання. Напрыклад, у Дзяржынскім раёне пуцёўкі атрымліваюць у першую чаргу інваліды першай і другой груп. І гэта правільна.

Але я размову вяду пра тое, як наш урад і А.Р.Лукашэнка дабраліся да пенсіянераў, разлічваючы кампенсаваць фінансавыя страты ў сувязі з павышэннем цэн на энерганосьбіты. Дык вось, апрача аплаты за пуцёўкі ў здраўніцах Міністэрства сацыяльнай аховы і працы ўвяло платныя паслугі на розныя працэдуры лячэння. Вось я ў лютым быў у санаторыі "Бярэзіна", што ў наваколлі г.Барысава. Па прыездзе ў здраўніцу даведаўся ад доктара, што, напрыклад, масаж, аплікацыі азекерыту і іншыя паслугі (акрамя фізіяпрацэдур) платныя. Адзін сеанс масажу каштуе 6 тысяч 400 рублёў, столькі ж і цеплавыя працэдуры азекерыту. Курс лячэння 8—10 сеансаў. Няцяжка падлічыць, колькі абыдзецца беднаму кліенту яго лячэнне. Я, напрыклад, падлічыў, каб аздаравіць усе хворыя месцы, патрэба дадаткова не менш як 200—300 тысяч рублёў, якіх, на жаль, у мяне не аказалася ў кішэні з-за галавацяпства асобных чыноўнікаў з Міністэрства аховы здароўя ці Саўміна, якія не паведамілі аб увядзенні аплаты за паслугі ў рэгіянальным цэнтры. Хворыя нямоглыя людзі сталі закладнікамі безадказнасці тых, хто размяркоўвае санаторныя пуцёўкі.

Увогуле, што тычыцца пенсій, то ў грамадстве адбылося расслаенне на бедных і багатых пенсіянераў. Звычайныя смертныя атрымліваюць у межах 300—350 тысяч рублёў, за якія вельмі не нашыкуеш, хаця б канцы з канцамі звесці. У той жа час асобная катэгорыя людзей, у першую чаргу былыя ваенныя, так бы мовіць, адстаўнікі, атрымліваюць штомесяц 700—900 і болей тысяч, хаця і не ваявалі ў гарачых кропках. Не пакрыўджаны і дзяржчыноўнікі — некаторыя атрымліваюць па мільёну і больш. А параўнаць пенсію сельскага механізатара альбо жывёлавода, які не адчувае ні рук, ні ног, выжаты як лімон, вымушаны працаваць пасля выхаду на пенсію. Так паступаюць і асобныя гарадскія пенсіянеры. Ды толькі зноў несправядлівасць — у працуючага пенсіянера кожны месяц здымаюць пэўную суму. А чаму былым ваенным і работнікам МВД выплачваюць поўныя пенсіі, хаця яны таксама працуюць?

Не, я не за тое, каб у адных адбіраць, а другім дабаўляць. Я — за справядлівыя адносіны да пенсіянераў усіх катэгорый .

Анатоль ШАРАЕЎ, пенсіянер.

г.Фаніпаль, Дзяржынскі раён.

Народная Воля http://www.nv-online.info
26 КРАСАВІКА 2007 г.

СКАНДАЛ

Ігар ЧАРНЯЎСКІ:

«Будынак былога кляштара плануецца прыстасаваць пад гасцінічны комплекс...»

Беларускі рэспубліканскі савет па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры ўхваліў перадпраектную прапанову па рэканструкцыі былога кляштара бернардзінцаў у Мінску — помніка архітэктуры барока XVII стагоддзя, што размешчаны па вуліцы Кірылы і Мяфодзія, 6 і 8.

Як паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры **Ігар Чарняўскі**, будынак былога манастыра плануецца прыстасаваць пад гасцінічны комплекс.

Спецыялісты мяркуюць, што гэты аб'ект сацыяльна-бытавога прызначэння, знаходзячыся побач з будынкам былога касцёла, не будзе дысанірава́ць з архітэктурай Верхняга горада.

Распрацоўшчыкі праекта з КУП "Мінскпраект" прапануюць актыўна выкарыстаць падземную прастору для паркінга, спартыўна-аздараўленчага і дзелавога цэнтра пры захаванні прасторы ўнутранага двара былога манастыра.

У той жа час аўтары праекта адмовіліся ад першапачатковай ідэі выкарыстання шкла ў афармленні фасадаў, бо гэта не гарманіруе з лініяй "ломаных дахаў", характэрнай для архітэктуры XVII стагоддзя.

Як зазначыў І.Чарняўскі, савет прапанаваў правесці *"комплекснае навуковае даследаванне помніка архітэктуры, паколькі ўзнікла шмат пытанняў, якія могуць праясніцца толькі пасля правядзення такіх работ"*. І.Чарняўскі мяркуе, што вынікі навуковых даследаванняў, у тым ліку археалагічных, *"могуць нават скарэктаваць функцыю аб'екта"*.

"Дата наступнага абмеркавання праекта на пасяджэнні савета залежыць ад тэрмінаў навуковага даследавання, якія вызначыць праекціроўшчыкам заказчык праекта — КУП "Мінская спадчына", —- паведаміў І.Чарняўскі.

Нагадаем, што адразу пасля таго, як стала вядома аб планах гарадскіх уладаў перадаць будынкі манастыра інвестарам для іх рэканструкцыі і прыстасавання пад гасцінічны комплекс, пачаўся збор подпісаў пад зваротам да кіраўніка дзяржавы за вяртанне кляштара бернардзінцаў рымска-каталіцкай абшчыне святога Іосіфа, якая трэці год штодня праводзіць набажэнствы за перадачу былой святыні вернікам.

Апрача таго, як паведамляе БелаПАН, пракуратура Мінска разглядае зварот старшыні грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" **Алега Трусава** па пытанні законнасці размяшчэння гатэля і аб'ектаў гандлёва-бытавога прызначэння на месцы манастыра бернардзінцаў. Але з будынкаў манастыра ўжо выселены службы ваеннай камендатуры і пракуратуры.

Марат ГАРАВЫ.

ТЫМ ЧАСАМ

«Ні ў адной з еўрапейскіх сталіц, якія шануюць сваю гістарычную спадчыну, немагчыма знайсці падобны прыклад размяшчэння ў кляштары забаўляльных аб'ектаў!»

Група беларускіх архітэктараў звярнулася з адкрытым лістом у Міністэрства культуры, Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, Мінгарвыканкам, а таксама Кіраўніцтва справамі прэзідэнта.

"Кляштар Бернардзінаў з прыстасаваннем пад гасцінічны комплекс — гэта найбуйнейшы помнік архітэктуры XVII стагоддзя гістарычнага цэнтра Мінска з багатай гісторыяй і унікальным культурным пластом, — напісана ў лісце архітэктараў. — Аднак праект "рэканструкцыі" сваёй сутнасцю накіраваны на поўнае знішчэнне ўсёй аўтэнтычнасці унікальнага аб'екта. У ім прадугледжана размяшчэнне паркінга. Вялізныя аб'ёмы зямельных прац пацягнуць за сабою вываз на сметнік у выглядзе будаўнічага смецця культурнага пласта, які фарміраваўся з часоў сярэднявечча, знішчэнне унікальнага дэкору будынкаў, што захаваўся да нашых дзён. Функцыя дадзенай гасцініцы прадугледжвае размяшчэнне ў былым кляштары забаўляльных аб'ектаў: казіно, боўлінга, рэстарана, басейна, што па меншай меры дзіўна. Нікога (ні праекціроўшчыкаў, ні інвестараў) не бянтэжыць нават суседства з галоўным праваслаўным комплексам краіны.

Нават калі канцэпцыя выявы аб'екта будзе зменена, згодна з пастановай выязнога пасяджэння Рэспубліканскага Савета па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 19 красавіка 2007 года, неабходна разгледзець альтэрнатыўнае функцыянальнае прызначэнне квартала гістарычнай забудовы. Ні ў адной з еўрапейскіх сталіц, якія шануюць сваю гістарычную спадчыну, немагчыма знайсці падобны прыклад размяшчэння ў кляштары забаўляльных аб'ектаў. Тым больш што ў Мінску такі гістарычны комплекс адзіны.

Перакананўча просім перагледзець непрымальнае функцыянальнае прызначэнне квартала гістарычнай забудовы, абумоўленае ў рашэнні Мінгарвыканкама ад 25 мая 2006 года №1012, з адпаведным пераглядам планіровачнай канцэпцыі рэканструкцыі кляштара Бернардзінаў.

Архітэктары Аляксей САРАЙКІН, Ілья НАУМІК, Аляксей КАЛЯСКОЎ".

ПАМЯЦЬ

Патрэбна дапамога

Музей гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі звяртаецца да грамадскасці з просьбай аб садзеянні ў пошуку месцаў гібелі ахвяр Халакоста і ва ўвекавечанні іх памяці.

У інтэрв'ю БелаПАН кіраўнік музея кандыдат гістарычных навук Іна Герасімава паведаміла, што сумесна з Саюзам беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын, а таксама з амерыканскім яўрэйскім аб'яднаным размеркавальным камітэтам "Джойнт" такая праца цяпер вядзецца ў Гомельскай вобласці. *"У гэтым рэгіёне, што найбольш пацярпеў ад наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, засталося вельмі мала яўрэяў, і па гэтай вобласці мы маем мінімум інфармацыі, якая нас цікавіць. Паводле матэрыялаў айчынных і ізраільскіх кніг памяці, архіваў і сельсаветаў, а таксама па ўспамінах відавочцаў складаюцца спісы загінуўшых ахвяр, фатаграфуюцца мемарыяльныя знакі на месцах масавага знішчэння яўрэяў у гады Другой сусветнай вайны, пошук і фіксацыя раней невядомых брацкіх магіл"*, — сказала І.Герасімава.

Паводле яе слоў, у гэтай працы музею дапамагаюць не толькі яўрэйскія абшчыны, але і мясцовыя жыхары. Напрыклад, жыхар райцэнтра Лельчыцы Уладзімр Грыб, які быў сведкам знішчэння нацыстамі мясцовых яўрэяў, напісаў успаміны аб гэтай трагедыі і патрабуе ад улад увекавечання памяці сваіх землякоў.

І.Герасімава зазначыла, што праца павінна весціся апаратыўна, бо сведкаў вайны становіцца ўсё менш. У будучым мяркуецца ўвекавечыць памяць загінуўшых усталяваннем на брацкіх магілах мемарыяльных знакаў.

Паводле звестак кіраўніка музея, у Беларусі налічваецца прыблізна 500 месцаў масавага знішчэння ахвяр Халакоста.

Марат ГАРАВЫ.

ЗЕМЛЯКІ

Дзмітрый Дастаеўскі прыехаў на радзіму продкаў

У вёску Дастоева Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці прыехаў праўнук Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага — Дзмітрый Дастаеўскі, які жыве ў Санкт-Пецярбургу.

Як паведаміў захавальнік фондаў літаратурна-краязнаўчага музея ў Дастоеўскай сярэдняй школе Анатоль Бурак, гэта першы візіт прадстаўніка роду Дастаеўскіх на радзіму продкаў.

Ларыса ШЫГАНАВА.

БЫЛО...

Бомба для гэбітскамісара

Шэрым кастрычніцкім ранкам 1943 года з вёскі Мялешкі выехала павозка з бульбай. Кіраваў канём вясковы настаўнік Юльян Андрэевіч Дробыш. Да вайны ён выкладаў у мясцовай сямігодцы матэматыку і выконваў абавязкі бібліятэкара. У яго пасля ўрокаў я браў дамоў кніжкі.

З дзяцінства ён пры хадзе кульгаў і абапіраўся на кіёк. Мусіць, гэтую акалічнасць пры выбары вазніцы ўлічылі партызаны — на інваліда немцы на апорных пунктах мо не звернуць пільнай увагі. Пра тое, што ў выпадку правалу аперацыі Юльяну Андрэевічу пагражае расстрэл, а яго жонцы і дзецям адпраўка ў канцлагер, ніхто не думаў.

А даручылі Юльяну Андрэевічу завезці ў Слуцк схаваную пад клубнямі бульбы 50-кілаграмовую авіябомбу з прымацаваным да яе дэтанатарам нацяжнога дзеяння. І даставіць яе належала на цэнтральную плошчу горада бліжэй да будынка, дзе размяшчаўся нямецкі гэбітскамісар са сваімі службамі.

Першы раз прыпынілі вазніцу каля бункера побач з мостам праз раку Вясейку, за восем кіламетраў да горада. Немец з аўтаматам на шыі загадаў паказаць "аўсвайс" — так называўся тады пашпарт, які мелі дарослыя і юнакі з шаснаццацігадовага ўзросту. Немец зірнуў у дакумент і вярнуў вазніцы: маўляў, можаш ехаць далей. Такая ж праверка была і каля моста праз раку Случ, дзе з амбразуры бункера пазірала "вочка" кулямёта.

А калі б немец шомпалам прамацаў насыпаную бульбу, то металёвы стук аб корпус бомбы стаў бы для возчыка прыгаворам... Пашанцавала, да цэнтра горада ён дабраўся без прыгод. Юльян Андрэевіч выехаў на плошчу насупраць будынка гарадской управы, скіраваў каня ў бок дзвярэй пры ўваходзе. Там стаяў з вінтоўкай паліцай у чорным шынялі. Ехаць упрытык да яго было небяспечна, таму Юльян Андрэевіч, злезшы з павозкі, прывязаў да лейцаў шнур, што злучаў іх з дэтанатарам для бомбы. І пачыкіляў міма развалін спаленага зімой таго ж года яўрэйскага гета. Тым часам паліцай, убачыўшы, што конь рушыў да яго, падышоў да павозкі, узяўся за лейцы — і бомба ўзарвалася. Каня і паліцая забіла, бульбяныя клубні разляцеліся мо на дзвесце метраў вакол. У вокнах жа будынка толькі павыляталі шыбы...

На ўскраіне горада Юльяна Андрэевіча ўжо чакала павозка з партызанскім сувязным, які ўзяў кірунак не на шашу, праз два масты, а ў абход, на вёску Падзерскія Агароднікі і далей, поплавам — на Мялешкі. Тым не менш некалькі дзён Юльян Андрэевіч, баючыся аблавы паліцаяў, баяўся быць дома, хаваўся. А такая небяспека была, бо з гэтай вёскі ў паліцыі служылі тры чалавекі і да іх маглі дайсці такія-сякія чуткі пра здарэнне ў Слуцку. Але ўсё, як кажуць, абышлося.

Я сустракаўся ў 80-я гады з Юльянам Андрэевічам. Успамінаючы той небяспечны рэйд з бомбай, ён зазначыў, што партызаны, напэўна, маглі б тую магутную бомбу выкарыстаць больш эфектыўна, напрыклад, для падрыву чыгункі пад варожым эшалонам.

У той год летам партызаны, заклаўшы ў будынак гарадской пошты не менш за пяць кілаграмаў толу, падарвалі яго разам з прыбудаваным крылом сталовай. Ад выбуху загінула і было паранена некалькі цывільных служачых. Жыхары горада і раёна, чые дарослыя дзеці прымусова былі адпраўлены на працу ў Германію, здавалі на пошце прадуктовыя пасылкі... Звестак пра загінуўшых немцаў не было чутно. А ў штабе партызанскага руху, мабыць, падрыў гарадской пошты трапіў у лік "стратэгічна важных" аб'ектаў ворага.

Міхась ТЫЧЫНА.

г.Слуцк.

СТРАНИЦЫ ИСТОРИИ

Ванкарем НИКИФОРОВИЧ (Чикаго)

Правда о стране Советов

Об одной книге, изданной на русском языке в Америке 70 лет назад

У меня в руках книга на русском языке, изданная в Чикаго в 1935 (!) году. Хранится она в библиотеке Чикагского университета. Называется просто: **"Что я видел в Советской России?"** На обложке подзаголовок: "Из моих личных наблюдений. С картой и иллюстрациями". Солидно звучит и имя автора: **Минский Мужик.** Уже в наши годы библиографы расшифровали имя того, кто скрылся под таким солидным псевдонимом: **Д.М.ГОРБАЦЕВИЧ.**

Символично и посвящение, вынесенное на специальную страницу: *"Порабощенным, закованным в цепи большевистской диктатуры, народам СССР посвящаю эту книгу"*. Разоблачение государственного и идеологического режима, установленного в той стране, подтвержденное многочисленными реальными фактами, авторскими наблюдениями и рассказами тех, с кем приходилось встречаться, — вот основная тема, которая проходит через все это уникальнейшее издание, от его первой страницы до последней.

В предисловии к книге автор (в дальнейшем будем называть его и так) рассказывает немного о себе, о том, как возник замысел этой книги и как она была издана. Родную Беларусь *Минский Мужик* покинул в 1913 году, когда ему было всего 18 лет от роду. И только через двадцать один год, в 1934 году, ему удалось осуществить естественную для многих эмигрантов мечту: побывать на родине. Хотелось повидаться с родственниками, увидеть страну детства и юности. Тем более что в самой Америке было время общей депрессии, и *"в тайниках души"*, как признается автор, он даже мечтал о том, чтобы вернуться и остаться в своей родной стране. Но — увы! — его мечта не осуществилась.

Более трех месяцев он провел в разных местах Советского Союза: в Ленинграде, Москве, в Украине, в городах и селах Беларуси. И пришел к однозначному выводу: "Столкнувшись с суровой и страшной советской действительностью, я понял, что жить в России нельзя. Надо было возвращаться в буржуазную Америку". Вернувшись, *Минский Мужик,* сын белорусских крестьян, который в Америке был обыкновенным рабочим, стал писать статьи о своей поездке в СССР и публиковать их в русскоязычной чикагской газете "Рассвет" (оказывается, была и такая). Автор писал об огромном интересе читателей к этим публикациям и о том шуме, который подняли американские коммунисты вокруг этих статей. Сами же читатели подняли вопрос об издании их отдельной книгой. *Минский Мужик* взялся за работу и до конца марта 1935 года пересмотрел, поправил свои статьи, подкрепил их ссылками и цифровыми данными. Написал для книги и новые статьи о молодежи, о пятилетках, о Красной армии и другие. Помогли и те, кто издавал газету "Рассвет", и в том же 1935 году книга вышла.

Многие факты, наблюдения и откровения в ней поражают даже сегодня, когда мы, как нам кажется, все знаем о том страшном советском времени. Если когда-нибудь состоится Международный суд, который бы вынес оценку той государственной системе, большевистской партии и карательным органам, проводившим политику геноцида против собственного народа (уверен, что это обязательно состоится), то многие страницы книги "Что я видел в Советской России?" *Минского Мужика* прозвучали бы на таком процессе вместе с основными доказательствами обвинения.

Композиционно книга построена очень просто: автор постепенно, шаг за шагом, описывает все этапы своего путешествия на кораблях, потом по железной дороге. По дороге в Ленинград он был в Англии, Дании, Швеции, Финляндии. Небольшие разделы книги рассказывают о том, что *Минский Мужик* видел в этих странах, что ему понравилось, а что нет. Специально он отмечает, что в Дании, например, правительство помогает безработным, а в Швеции развито правительственное кооперативное домостроительство. Но уже первые часы пребывания в Ленинграде сразу же дали понять, что все вокруг — совершенно иной мир, далекий даже от самых плохих представлений. *"Не хотелось верить, что мы находимся в Ленинграде, в единственной в мире социалистической стране, где нет капитализма, но зато господствуют наган, нужда и нищета"*, — так пишет о своих впечатлениях автор.

Наган, нужда и нищета... Эти определяющие понятия-символы проходят потом через всю книгу. В Ленинграде **Минского Мужика** поражает обилие красноармейцев с ружьями; всюду грязь, крысы и мыши, нищета в квартирах простых людей, в столовых. В так называемых Советах — не выборные лица, а назначенцы. 1 января 1935 года в СССР была отменена карточная система, существовавшая три года, и после этого резко были повышены розничные цены на товары первой необходимости. Своим попутчикам в вагоне поезда из Ленинграда в Москву автор, к их огромному удивлению, рассказывает, что в США и Канаде только официально числится более 300 тысяч русских эмигрантов, но они имеют свои организации, школы, издают свои газеты. (Думаю, что эта информация удивит и многих наших сегодняшних читателей.)

В Москве *Минский Мужик* попадает в ту же невыносимую атмосферу нищеты и угнетения. Здесь с особой силой добавляется ощущение постоянного страха за свою жизнь. Всюду — вооруженные красноармейцы, особенно вокруг Кремля, где *"заседает всемогущий диктатор Сталин"*. Описывая усыпальницу русских царей в одной из церквей Кремля, автор замечает: *"Тут же стоит тяжелый и крепкий гроб сталинского праотца Ивана Грозного"*. Заметим, что это сказано еще до массовых репрессий 1937-го и последующих советских лет. На Белорусском вокзале и на улицах он увидел обилие нищих, одетых в лохмотья беспризорных детей, которые все время просили: *"Дяденька, дай копеечку..."* Поразила его даже атмосфера в зале одного из театров во время спектакля: *"Тяжелая атмосфера, как над Лондоном туман, висит над советскими гражданами и не дает им свободно дышать, быть веселыми и жизнерадостными. Даже юмор не действует на терроризированного и запуганного советского гражданина"*.

И вот автор приезжает в Беларусь, встречается с самыми разными людьми, ведет очень осторожные разговоры: все боятся говорить правду. Приводятся не только свои наблюдения, но также многие сведения из газет, статистические цифровые данные. Следует первый вывод: московские большевики создали форму союза республик только для того, чтобы *"показать иностранным государствам, что они — за независимость и самоопределение народностей"*. А на самом деле получилось вот что: *"У самого отъявленного мошенника имеется больше совести, чем у этих советских республик независимости и свободы. Москва диктует им свою волю. Они должны беспрекословно выполнять все наказы и приказы Москвы"*. Еще раз хочется напомнить, что это написано в 1935 году.

Любопытны и непосредственные белорусские авторские впечатления. Острый жилищный кризис в Минске (квартиры, в *"которых не могла бы жить американская собака"*). Построенный за счет разорения тысяч крестьян *"дворец"* казарменного типа (то, что называют Домом правительства и до сих пор выдают за шедевр архитектуры). В ветхом крестьянском доме в деревне под Слуцком старушка со слезами на глазах рассказывает о непрерывных *"национализациях"* личного хозяйства и о непомерных налогах.

Необычайно запущенное состояние еврейского кладбища в Слуцке. В этом же городке каторжане, которых усиленная вооруженная охрана гонит на работу. *"Хамунист"* — так называют простые крестьяне тех, кто командует и издевается над ними. И совершенно неожиданный вопрос крестьянина-старика: "Скажите, придут ли к нам иностранные державы, чтобы спасти нас от гибели?" *Минский Мужик* не узнает своей родной деревни после двадцатилетнего отсутствия: *"Дворы поредели, хаты измельчали, заборы и ворота у дворов исчезли, колодцы высохли, не поют петухи и не слышно лая собак. Даже не видно играющих детишек. Мертвая тишина. На душе стало тяжело и грустно"*. Подробно описываются жизнь и мучения многих крестьянских семей, крушение надежд, трагедии судеб. В одиннадцати ближних деревнях автор насчитал 154 человека, отправленных в ссылку. *"В разрушении старой деревни большевики достигли "успехов" на сто процентов"*, — вот результат пресловутой коллективизации.

Очень многие примеры и описания подчеркивают антинародность советского государства, *"построенного на грубой эксплуатации, бессовестной лжи и неслыханном обмане"*. Запрещено, например, даже держать в домах сало с кожей. В сельской местности не хватает школ, те что есть, в ужасно запущенном состоянии. И в деревне, и в городе фактически отсутствует процесс нормального воспитания детей. *"За малейшее возражение, выраженное публично, колхозника, как и частника, забирают поздней ночью и ссылают в Сибирь на каторжные работы, а передовых колхозников расстреливают в подвалах ГПУ"*.

Нет священников в приходах и раввинов в синагогах, культовые здания просто закрываются и разрушаются. *"Сталин не верит в молитвы,* — пишет автор, — *а верит в штыки и ГПУ, которое огнем и мечом охраняет его, насаждает рабство и гнет"*. Налоги, государственные цены — безжалостный грабеж среди бела дня. Особо тяжелое положение женщин, ставших, по существу, рабынями власти. Везде — казарменные порядки, даже вокруг зернового поля стоит вооруженная охрана. *"В капиталистических тюрьмах заключенные имеют больше свободы, прав и независимости, чем колхозники"*, — тоже одно из любопытных авторских наблюдений. Даже на свадьбах поются песни о тяжелой доле, о том, что эта жизнь надоела, и после смерти *"родные не узнают, где могила моя"*. Возмущен автор и придуманным в Москве эпитетом *"кулак"*. Он видел многих *"кулаков"* — затравленных, бедных крестьян, немногие из которых *"имеют свой собственный хлеб до нового урожая"*. Рассказали ему крестьяне и о горожанах-евреях, над которыми власти издеваются *"даже хуже"*, чем над ними.

Встречался *Минский Мужик* и с украинцами, которые поведали ему о страшном голоде в 1933 году. Приводятся цифры: в результате голодомора только на Украине погибло 7 миллионов, а всего в России — около 10 миллионов человек. Думается, что тогда, когда вышла книга, эти цифры прозвучали вообще впервые.

Автор приводит много цифр и статистических данных, часто ссылается не только на свои наблюдения и впечатления, но и на некоторые официальные источники. В частности, цитируется изданный в 1934 году в Москве в издательстве "Союзоргучет" справочник "Социалистическое строительство в СССР". Некоторые авторские выводы и предположения звучат сегодня просто поразительно, удивляя своим пониманием и предвидением, иногда, правда, наивным. Например, он пишет о том, что в случае возможной войны может вырваться недовольство народа, и это будет *"самая опасная угроза для Сталина"*. Звучит и надежда, что *"все тираны и душители свободы и правды свергались во время войн"*. А вот еще одно, объясняющее многое предвидение: *"В будущем может получиться так, что окрепшие республики уйдут из-под власти угнетающего центра Москвы"*. Автор приводит большой перечень необходимых реформ, без которых жизнь России никогда не будет свободной. Естественно, и сегодня многие эти предложения — только наивная мечта.

Я привел лишь некоторые отрывки из многочисленных наблюдений и рассуждений *Минского Мужика.* О себе он говорит в конце книги предельно скупо: *"Я не профессиональный литератор, я рабочий от станка. Писал после тяжелого физического труда и даже ночами... Я болел душой, когда видел весь кошмар в СССР, и еще больше болел тогда, когда писал эту книгу"*.

Идет время. Вот уже и отметили пятнадцатилетие распада того государства, которое называлось СССР. Не умолкал дружный хор тех, кто и в российской, и в белорусской, и в эмигрантской прессе осуждал Беловежские соглашения и сожалел о случившемся тогда. Они, естественно, не читали книгу *Минского Мужика* "Что я видел в Советской России?". А не помешало бы.

ПРАЕКТ

Начная опера ля сцен святыні

У рамках святкавання 1145-годдзя Полацка запланаваны незвычайны музычны праект — каля сцен Сафійскага сабора прагучыць начная опера.

Як паведаміла загадчыца канцэртнага аддзела Полацкага нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка Лілія Емяльянава, канцэрт адбудзецца 1 чэрвеня. Ён будзе доўжыцца дзве гадзіны — з 22.00 да поўначы пад адкрытым небам каля сцен полацкай святыні. У канцэрце возьме ўдзел Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы Рэспублікі Беларусь.

"У канцэртнай зале Сафійскага сабора ўжо прайшла серыя канцэртаў гэтага тэатра. Але на начной оперы слухачоў, а мы спадзяемся, што гэта будзе элітарная публіка, чакаюць сюрпрызы. У выкананні тэатра оперы прагучаць самыя розныя творы: арыі, класіка, джаз, аперэта. А ідэя правесці такі канцэрт належыць намесніку дырэктара тэатра Аляксандру Пятровічу", — расказала Л.Емяльянава.

Паводле яе слоў, падобны музычны праект у Віцебскай вобласці будзе ажыццяўляцца ўпершыню. *"Але ў Беларусі такія канцэрты ўжо праходзілі. Напрыклад, некалькі гадоў таму начная опера гучала ў Мірскім замку"*, — дадала спецыяліст.

Білеты на начную оперу коштам 25 тысяч рублёў будуць прадавацца ў Полацку і Мінску.

Таццяна ЧАБАТАРОВА.

ЗВЕРЬЕ МОЕ

Людмила АТРАШКЕВИЧ:
«Мы получаем гораздо больше любого банковского служащего...»

Одни заводят дома крокодилов и игуан.

Другие вместе со своей собакой-медалисткой редкой породы не пропускают ни одной выставки.

Третьи берут шефство над животными в зоопарках.

Все эти люди называют себя любителями животных.

Но далеко не все из них подберут на улице хромую собачонку или плешивого котенка...

В этом материале речь пойдет как раз о тех, кто не пройдет мимо бездомного кота.

Есть такая работа — животных спасать

Общественная организация защиты животных "Ратаванне" была создана более десяти лет назад небольшой группой энтузиастов. Сегодня в организации уже состоит более 300 человек, все они — добровольцы. "Ратаванне" опекает более 600 собак и кошек.

Три диспетчера ежедневно принимают звонки от людей, которые хотят завести или — наоборот — отдать собаку или кошку в хорошие руки. Благодаря телефонной службе, новых хозяев нашли более 5000 животных.

В пункте приема и временного содержания бездомных животных по улице Гурского, 42 "Ратаванню" выделили четыре комнаты, в которых на сегодня содержится около 60 собак и кошек. И всех надо выгулять, накормить, прибрать за ними и просто пообщаться. Этим и занимаются члены общества и волонтеры. Любой желающий может зайти в приют и взять собаку или кошку домой.

"С января по апрель этого года мы пристроили 60 собак и кошек, — говорит руководитель "Ратавання" **Людмила Атрашкевич**. — *Это очень много. Когда мы отдаем животное, то на его место берем другое".*

Кстати, за время разговора с Людмилой Алексеевной было несколько звонков: от студентки, которая хочет выгуливать животных, от девочки, которая принесла переноску для кошек, пришло несколько человек, желавших "усыновить" собаку.

Не отлавливайте кошек!

"Нам помогают и фирмы, и простые люди, а от государства, к сожалению, никакой поддержки нет, — говорит Людмила Алексеевна. — В Беларуси даже нет закона о защите животных. Есть лишь закон об обращении с животными, который был одобрен двумя палатами Национального собрания, но его не подписал президент. Уже два года этот закон находится на доработке. Но и от него польза весьма относительная — за основу взято решение горсовета о том, что ни одно животное без хозяина не должно быть ни на улице, ни в подъезде, ни на чердаке, в противном случае оно должно быть отловлено и помещено в приемник. Также там есть пункт о том, что в квартире можно содержать лишь два животных. На мой взгляд, это лишает многих животных спасения, а людей, готовых заботиться о брошенных братьях меньших, возможности проявить свою доброту. Более того — они будут оштрафованы за свою помощь.

Сейчас мы готовим письмо в горсовет с просьбой не отлавливать кошек. Надеемся, что хотя бы это наше предложение будет учтено. Мы считаем, что стоит отлавливать только явно больных, диких кошек, которые могут быть опасны. А ведь если это здоровое животное, оно совершенно безобидно. И если оно стерилизовано, если за ним смотрят люди, то его незачем отлавливать. Пусть кошки живут, они ведь санитары наших подвалов. К тому же часто в приемники попадают и ухоженные домашние кошки, которых хозяева просто выпустили погулять. Нельзя назвать гуманным и срок, в течение которого животное находится в пункте приема и временного содержания до того, как его усыпят — всего пять дней. Некоторые пункты держат животных и больше, в зависимости от размеров предоставленных им помещений. С другой стороны, даже для брошенного животного сидеть в клетке, как в тюрьме, без выгула — тоже не выход..."

Равнодушие — это тоже жестокость

По словам Людмилы Атрашкевич, в "Ратаванне" иногда звонят люди и рассказывают, что их соседи плохо обращаются с животными — бьют, не выгуливают, не кормят, держат на балконе. В таких случаях звонивших направляют в милицию. Но уголовной ответственности за жестокое обращение с животными нет. Да и случаи, когда людей штрафуют, тоже редки.

"Но я считаю, что предавать огласке такие факты просто необходимо, — высказывает свое мнение Людмила Атрашкевич. — Ведь равнодушие — это тоже жестокость".

Людей перевоспитать сложнее, чем животных?

Общество "Ратаванне" выступает за стерилизацию животных. Причем специалисты "Ратавання" не только пропагандируют стерилизацию как способ избежать рождения ненужного потомства, но и сами делают операции и дают направления в городские клиники. К слову, инвалидам, пенсионерам, малоимущим и тем, кто содержит большое количество животных, стерилизацию их питомцев делают совершенно бесплатно.

Необходимость стерилизации — проблема вовсе не надуманная. Каждый год отлавливается и усыпляется порядка 80 тысяч животных. И проблема не решается — бездомных животных все равно много на улице. А усыпление здоровых животных, только потому, что они ненужные, не только морально тяжело, но и экономически невыгодно. Самый лучший выход из этой ситуации — предотвращение появления малышей, которые пополнят ряды бездомных.

"Менталитет наших людей таков, что многие считают грехом избавиться от только что родившегося щенка, а уже потом, когда он вырастет, выкинуть его грехом почему-то не считается, — рассуждает Людмила Алексеевна. — *Люди, конечно, разумные существа, но вот перевоспитать их оказывается ничуть не легче, чем заставить животных не размножаться.*

Больше, чем зарплата

"В нашем мире есть много жестоких и безответственных людей, но милосердных — не меньше, — считает Людмила Атрашкевич. — Например, те, кто работает в нашем приюте, не получают зарплату. Они, наоборот, тратят свои деньги и время на животных. Но на самом деле мы получаем гораздо больше любого банковского служащего — любовь и благодарность животных. Ты приходишь в приют, радуешься, когда какой-то котенок выздоравливает после болезни, когда видишь, что он ждет тебя. Это заставляет работать дальше..."

Ольга ПРУДНИКОВА.

К СВЕДЕНИЮ

По словам Людмилы Атрашкевич, общественной организации защиты животных "Ратаванне" требуются волонтеры, чтобы выгуливать животных, убирать за ними, кормить.

Нужны ветпрепараты для первичной обработки животных, а также ошейники, поводки, намордники, туалеты для кошек, продукты питания.

"Пожалуйста, не останьтесь в стороне, протяните руку помощи животным...", — говорит руководитель "Ратавання" Людмила Атрашкевич.

E-mail: ratavanne@mail.ru

ВЫСТАВЫ

Калі моцна любіш, то неабавязкова аб гэтым моцна крычаць

Такое ўражанне ўзнікае міжволі, калі пераходзіш ад карціны да карціны Аляксея Марачкіна ў сталічнай мастацкай галерэі "ЛаСандр-арт". На вернісаж з гэтай нагоды прыйшлі сябры, прыхільнікі творчасці выдатнага майстра пэндзля і вядомага грамадскага дзеяча, ягоныя вучні і паплечнікі, пісьменнікі і дзеячы кінамастацтва. Перш за самога віноўніка ўрачыстасці яе сапраўднымі героямі нечакана сталі менавіта яны, госці, якіх Аляксей Антонавіч прадстаўляў і вітаў са шчырай цеплынёй і аб якіх з захапленнем гаварыў як пра адданых змагароў за нашу нацыянальную культуру, беларускую справу.

Але, можа нехта здзівіцца, як жа ўдаецца мастаку быць такім усюдысным — і ў актыўнасці грамадскай пазіцыі, і ў багатым плёне апантанай творчай працы? Гэта ж трэба, феномен нейкі: адначасна ягоныя творы можна было пабачыць і на нядаўняй маштабнай выставе суполкі "Пагоня" Беларускага саюза мастакоў у Палацы мастацтва, і на сядзібе Партыі БНФ, дзе экспануецца грандыёзнае па змесце палатно "Плошча" аб юных героях нашага часу. І вось зараз — у зале, дзе пануе, можна сказаць, чыстая лірыка. Як удаецца яму быць такім разнастайным — і разам з тым такім цэльным, гарманічным у перакананнях, мастакоўскім крэда?

Сакрэт, пэўна, у маштабе асобы, неардынарнасці і багацці таленту, цалкам аддадзеным аднаму — Бацькаўшчыне. У гэтым яшчэ раз пераконвае і выстава, дзе побач з палотнамі апошніх год — і даўнія, яшчэ са студэнцкай пары работы. Высокім мастацкім узроўнем, унутраным настроем яны не выпадаюць з шэрагу больш позніх, складаюць з імі адну спеўную мелодыю.

...Зусім, здавалася б, просты сельскі пейзаж: бярэзнічак сярод аснежанай роўнядзі, санны вазок праз поле. Яшчэ зіма, яшчэ замглёнае шэранню неба. Але нейкім невытлумачальным чынам ужо ўгадваецца дзесьці там, за гарызонтам пакуль не бачнае святло, чуецца пах ужо блізкай вясны...

Зноў — зімовыя дрэвы ў чаканні хуткага абуджэння ад сну. І буянне зеляніны над летнім возерам, і радасныя фарбы жыцця ў пышных кветках верасня. І партрэт "Беларус", з якога глядзіць сама душа чалавека, молатага-перамолатага цяжкай сялянскай доляй, але не скаронага ёю. І таму на свята з куфра дастаецца белая палатняная вышыванка...

Кожная работа майстра — свята, свята, свята. Можа, галоўная яго загадка-разгадка ў тым, што, да чаго ні дакранаецца пэндзаль, спачатку дакранаецца ягонае сэрца? Ён любіць тое, што піша. Любіць людзей, з якімі зводзіць яго лёс, родныя краявіды, кожнае дрэўца і кожную травінку. Калі ён бачыць, як пляжыцца хараство бацькоўскай зямлі, яе будучыня, то яго любоў сплаўляецца з гневам і болем. Але на апошняй выставе яна ціхая, прасветленая, без крыку, ды не менш моцная, чым у творах публіцыстычнага характару.

— *Аляксей Марачкін — непаўторная і магутная постаць у беларускім мастацтве,* — падсумавала ўражанні гасцей вернісажу гаспадыня галерэі элітарнага сучаснага мастацтва **Ларыса БОРТНІК.** — *Ён нераўнадушны да ўсяго, што дзеецца навокал і што калісьці перажыла наша Радзіма. Пазіцыя мастака і грамадзяніна ў ім знітаваны ў адно. І таму, гледзячы на яго дзівосныя творы рознай пары, можна смела сказаць: класіка, сапраўдная класіка!*

Не пагадзіцца з гэтым не магу.

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Пакуль улады не знялі блакаду, зрабіце, калі ласка, перадаплату за будучыя нумары «Народнай волі»

Шаноўныя чытачы!

На жаль, і сённяшні нумар газеты мы вымушаны былі друкаваць у Смаленску, распаўсюджваем, як і раней, уласнымі сіламі.

Спадзяёмся, што перамовы з уладамі дадуць плённы вынік. Але пакуль давайце дзейнічаць так: хто не зрабіў **перадаплату** за майскія нумары — калі ласка, зрабіце гэта ў бліжэйшыя дні. З такой просьбай рэдакцыя звяртаецца і да тых, хто запазычыўся, г.зн. у красавіку атрымліваў газету авансам. Шкада, але, калі Вы не падтрымаеце "Народную волю", нам давядзецца развітацца.

Для тых, хто ўпершыню хоча стаць нашым чытачом, патлумачым: аформіць **перадаплату** можна ў любы дзень. Як толькі нам стане вядома, што Вы заплацілі грошы, праз 2—3 дні атрымаеце свежыя нумары газеты. Таму хутчэй у любы філіял "Беларусбанка" альбо на пошту!

Заадно паўтараем нашу настойлівую просьбу: агітуйце за "Народную волю" блізкіх, суседзяў, сяброў па працы, вучобе.

А чаму б не аформіць **перадаплату** за будучыя нумары для таго, каго Вы збіраецеся віншаваць з днём народзінаў ці з нейкай іншай нагоды?

Ведаеце людзей, якія з задавальненнем чыталі б "Народную волю", але, на жаль, у іх цяжкае фінансавае становішча? Калі ласка, дапамажыце ім аформіць **перадаплату**, ваша дабрачыннасць адгукнецца шчырай удзячнасцю ў сэрцах тых, каму Вы зрабілі дабро.

Каб аблегчыць вашы клопаты, і сёння друкуем узоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом "Народнай волі", паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары бягучага і наступных месяцаў (можна нават да канца паўгоддзя), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператы́ўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за тры месяцы адпаведна 28.500 і 45.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179

ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за апрель, май, июнь 2007 г.				
(ненужное зачеркнуть)				

Кассир — Плательщик — Пеня — Всего

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за апрель, май, июнь 2007 г.				
(ненужное зачеркнуть)				

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П. — Плательщик — Пеня — Всего

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за апрель, май, июнь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия

имя **отч.**

индекс почтового отделения

область

район

название населенного пункта

город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)

улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*

дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

ГУЧНАЯ СПРАВА

Што Віктар Каліна запяе ў судзе?

Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі накіравала ў Ленінскі суд Мінска матэрыялы крымінальнай справы ў дачыненні да вядомага выканаўцы Віктара Каліны і яго жонкі Святланы.

Як паведаміў БелаПАН начальнік упраўлення па расследаванні злачынстваў у сферы арганізаванай злачыннасці і карупцыі галоўнага ўпраўлення папярэдняга расследавання МУС Дзмітрый Данільчык, В.Каліна абвінавачваецца ў арганізацыі махлярства ў асабліва буйным памеры (ч.4 арт.16 і ч.4 арт.209 КК), арганізацыі заведама непраўдзівага даносу (ч.4 арт.16 і ч.2 арт.400 КК) і заведама непраўдзівае паказанне (ч.2 арт.401 КК). Другі і трэці склады тычацца дзеянняў беларускага выканаўца ў Маскве, яны былі ім ажыццёўлены для атрымання страхоўкі за нібыта выкрадзены аўтамабіль "Мерседэс". Святлана Каліна абвінавачваецца ва ўчыненні махлярства ў асабліва буйным памеры (ч.4 арт.209 КК).

Зараз Віктар Каліна знаходзіцца пад вартай, а яго жонка 21 лютага была адпушчана са следчага ізалятара пад залог.

Нагадаем, 5 студзеня 2007 года В.Каліну арыштавалі па абвінавачванні ў махлярстве. Яшчэ раней, 27 снежня 2006 года, у Мінску была затрымана, а потым арыштавана яго жонка. Яе затрымалі ў "Абсалютбанку" пры спробе незаконнага атрымання страхавой сумы ў памеры больш як 71 млн рублёў у сувязі з нібыта выкраданнем у Маскве аўтамашыны "Мерседэс", застрахаванай на 34 тысячы долараў.

Паводле слоў Д.Данільчыка, "Мерседэс" знойдзены ў Беларусі, тэрыторыю краіны ён не пакідаў. Следствам устаноўлены саўдзельнік мужа і жонкі Каліна, нейкі расійскі грамадзянін. Матэрыялы ў дачыненні да яго накіраваны ў праваахоўныя органы Расіі.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.

Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. По заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 25.04.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №